

ХТО СТАЎ ТРЫУМФАТАРАМ «АТЛЕТЫКІ»? 3



КАЛЕКТЫЎНАЕ ДЗЯЦІНСТВА Ў КУПАЛАЎСКІМ 9

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

11 СТУДЗЕНЯ 2020 г. СУБОТА № 6 (29120)

## ЦЫТАТА ДНЯ



**Святлана КУЗЬМІЧ, намеснік начальніка Рэспубліканскага цэнтра па гідраметэаралогіі, кантролі радыеактыўнага забруджвання і маніторынгу навакольнага асяроддзя Мінпрыроды:**

*«Мы працуем над пытаннямі адаптацыі да змен клімату. Адзін з кірункаў — неабходнасць змены тэрмінаў сяўбы, уборкі. Карэкціроўкі патрабуюць і тэрміны правядзення некаторых агратэхнічных работ. З улікам таго, што пад змяненнем клімату разумеецца не толькі павышэнне тэмператур, але і засухі, якія ў Беларусі пачасціліся і сталі пачынацца ўжо ў красавіку, пытанне выпрацоўкі рэкамендацый для сельскай гаспадаркі патрабуе сістэмнага падыходу. Над гэтым зараз працуе Нацыянальная акадэмія навук».*

# Знойдзена ў Беларусі



**Майстар буравой Дзмітрый ШЧУРЭВІЧ *(у цэнтры)* і памочнікі бурыльшчыка Аляксей КУХАРАЎ і Арцём РЭМЕЗ.**



Фота БелТА.

У Гомельскай вобласці «Беларуснафта» выявіла тры новыя залежы чорнага золата. Паводле папярэдняй ацэнкі, геалагічныя запасы знойдзенай нафты складаюць 800 тысяч тон.

## КОРАТКА

- Дабрачынны інклюзіўны праект «Радасць у падарунак» стартуе 13 студзеня ў Беларусі.
- **Нацыянальны аэрапорт Мінск зноў стаў самым пунктуальным у свеце па версіі OAG.**
- ДАІ заклікае кіроўцаў быць асабліва ўважлівымі паблізу ўстаноў адукацыі.
- **Унікальнае найбольш поўнае даведачнае выданне пра расліны Беларусі ўбачыла свет. Над гэтай кнігай навукоўцы Інстытута эксперыментальнай батанікі імя В. Ф. Купрэвіча НАН Беларусі працавалі больш за 20 гадоў.**
- Le Figaro ўключыла Беларусь у топ-20 турыстычных напрамкаў 2020 года, назваўшы нашу краіну «спячай прыгажуняй Еўропы».
- **Для раённых бальніц Магілёўскай вобласці у 2019 годзе была закуплена 31 машына хуткай дапамогі.**

ISSN 1990 - 763X

Погляд на праблему

## НЕ ПРАПАСЦІ БЕЗ ПАРЫ

### Чаму мужчыны жывуць меней і менш клапоцяцца пра сябе



**На напісанне гэтых радкоў, можна сказаць, падштурхнула сухая банкаўская статыстыка. Аказваецца, беларускія жанчыны назапасілі ў банках амаль удвая больш сродкаў, чым мужчыны, што само па сабе нечакана. Як вядома, мужчыны ў нас зарабляюць больш... Проста яны радзей выступаюць у якасці ўкладчыкаў. А яшчэ банкаўскія аналітыкі адзначылі, што мужчын, паводле статыстыкі, меней, ды і жывуць яны менш. А то, несумненна, бралі б большы ўдзел у эканоміцы ў выглядзе банкаўскіх рахункаў.**

### У АГНІ І ЧАРЦЫ

Аб працягласці жыцця абодвух полаў многа гаварылі ў нас у кантэксце павышэння пенсійнага ўзросту, ды і наогул гэтая тэма вечна на слыху. Нашы мужчыны паміраюць маладзейшымі за жанчын. Факт. Зноў праблема напомніла аб сабе крымінальнымі зводкамі першых дзён новага года.

Паводле слоў **афіцыйнага прадстаўніка Брэсцкага абласнога ўпраўлення МНС Сяргея МАШНОВА,** у вобласці за першую дэкаду студзеня ў агні загінулі чатыры чалавекі. Усе мужчыны, дарэчы. І найбольш паказальным у гэтым сэнсе, калі можна так сказаць аб трагедыі, стаў выпадак у вёсцы Махро Іванаўскага раёна.

СТАР. 4

Практычнае радзімазнаўства

## ЭТНАКАЗКА НЕТРАНЗІТНАЙ ВЁСКІ

### Ці не страціць вядомы ў краіне музей свой каларыт?

**Музей у вёсцы Гудзевічы, што ў Мастоўскім раёне, мне ўпершыню давялося наведаць каля дзесяці гадоў таму. Тады экскурсію правёў сам заснавальнік музея, апантаны сваёй справай чалавек, былы настаўнік Алесь БЕЛАКОЗ. Гэта яго намаганнямі невялікая вёска ўдалечыні ад трасы атрымала паўстагоддзя таму вельмі цікавы этнаграфічны аб'ект. Асабліва ўразіла беларуская хатка з саламяным дахам і інтэр'ерам сялянскага дома XIX стагоддзя. Чарговае наведванне парадавала новым выглядам — музей нібы атрымаў другое нараджэнне. Зроблены рамонт, пашырылася экспазіцыя, распрацаваны анімацыйныя праграмы. Разам з тым выклікаў неразуменне выгляд этнаграфічнай хаткі — яе саламяны дах чамусьці замянілі на сучасны шыфер...**

СТАР. 8



Блізкая ўлада

# МУЗЕЮ ПАРЛАМЕНТАРЫЗМУ — БЫЦЬ!

**Ідэя яго стварэння прагучала 10 студзеня ў час прыёму грамадзян старшынёй Савета Рэспублікі Наталляй Качанавай**

**Адзін з наведвальнікаў нагадаў, што 13 студзеня 1997 года адбылася першая сесія Савета Рэспублікі. Такім чынам, роўна праз два гады верхняй палаце парламента споўніцца чвэрць стагоддзя — прыгожая і важная напярэдадні дата. З гэтай нагоды Аляксандр Вярцінскі, дарэчы, сам у мінулым парламентарый, дэпутат Вярхоўнага Савета, вырашыў асабіста прапанаваць старшыні Савета Рэспублікі план стварэння музея беларускага парламентарызму. Агучыў нават і тое, як можна знайсці пазабюджэтныя крыніцы фінансавання.**



Фота БелТА.

Ідэя музея не толькі зацікавіла Наталлю Качанаву, але выклікала гарачую падтрымку і ўдзячнасць. «Мы абавязаны гэта зрабіць», — выказала яна ўпэўненасць. Ёсць час падумаць і над арганізацыйнымі пытаннямі, і над афармленнем цікавай, разнастайнай і ў пэўным сэнсе пераканаўчай экспазіцыі музея. Бо мінаюць гады, многае забываецца, а людзі, асабліва моладзь, павінны ведаць праўду пра развіццё парламентарызму ў суверэннай Беларусі.

Але аўтар «музейнай» ідэі ўсё ж быў нетыповы наведвальнік для гэтага дня прыёму. У асноўным людзі ішлі са сваімі вострымі жыццёвымі праблемамі і пытаннямі, вырашэнне якіх па розных прычынах, у тым ліку і з-за бюракратычных падыходаў мясцовых улад, зацягвалася, тармазілася. Усіх сваіх суразмоўцаў Наталля Качанава ўважліва выслухала, дала карысныя парады, узяла асобныя звароты пад асабісты кантроль.

Так, старшыню Савета Рэспублікі ўразіла сумная гісторыя мінчаніна, вымушанага пасля разводу з жонкай, пазбаўленай бацькоўскіх правоў, жыць з ёй пад адным дахам. Яе асацыяльныя паводзіны і ўчынкі, якія не адпавядаюць нормам і правілам паводзін людзей, грамадскай маралі, адмоўна ўплываюць на выхаванне двух дзяцей. Аднак раз'ехацца былыя муж і жонка не могуць — заканадаўства не дазваляе. Гэтая сітуацыя, на думку Наталлі Качанавай, сведчыць пра тое, што трэба ўносіць карэктывы ў Дэкрэт № 18 «Аб дадатковых мерах па дзяржаўнай абароне дзяцей у нядобранадзейных сем'ях».

Потым у размове з журналістамі яна сказала, што такая форма работы, як прыёмы грамадзян, апраўдала сабе. Зваротная сувязь павінна быць. Гэта, па словах спікера верхняй палаты парламента, дазваляе пачуць людзей, лепш бачыць іх праблемы, улічваць звароты грамадзян пры падрыхтоўцы законапраектаў, своечасова ўносіць змены ў дзеючыя законы, пры неабходнасці выходзіць з прапановамі на ўзровень Прэзідэнта. У цэлым прыёмы грамадзян дазваляюць ацаніць, як працуе заканадаўства на практыцы.

**Леанід ТУГАРЫН.**

## Нумары даверу

**Чарговыя прамыя тэлефонныя лініі пройдуць 11 студзеня ў аблвыканкамах і Мінгарвыканкаме**

**На званкі жыхароў краіны з 9.00 да 12.00 будуць адказваць:**

- намеснік старшыні БРЭСЦКАГА аблвыканкама Вадзім Іванавіч АЛЬШЭЎСКІ. Тэл. 8 016 221 31 21;
- кіраўнік спраў ВІЦЕБСКАГА аблвыканкама Аляксандр Уладзіміравіч СЫСОЕЎ. Тэл. 8 021 222 22 22;
- намеснік старшыні ГОМЕЛЬСКАГА аблвыканкама Уладзімір Уладзіміравіч ГАРБАЧОЎ. Тэл. 8 023 233 12 37;
- намеснік старшыні ГРОДЗЕНСКАГА аблвыканкама Віктар Францавіч ПРАНЮК. Тэл. 8 015 273 56 44;
- намеснік старшыні МАГІЛЁЎСКАГА аблвыканкама Руслан Барысавіч СТРАХАР. Тэл. 8 022 250 18 69;
- першы намеснік старшыні МІНСКАГА аблвыканкама Ігар Мікалаевіч МАКАР. Тэл. 8 017 500 41 60;
- першы намеснік старшыні МІНСКАГА гарвыканкама Фёдар Віктаравіч РЫМАШЭЎСКІ. Тэл. 8 017 222 44 44.

Разумныя грошы

# Доўгатэрмінова захоўваць у рублях стала выгадна

## Гэта таму, што долар «стаіць» і нават таннее

**Як толькі ў нас з'яўляюцца лішнія грошы, узнікае пытанне, куды іх укласці, каб яны не згубіліся, а лепш — прынеслі нейкі дадатковы прыбытак. У фінансістаў наконт гэтага прапаноў хапае. Але не ўсё так проста, бо тэндэнцыі змяняюцца. Аналітыкі ўпэўненыя, што грошы павінны працаваць нават тады, калі поспехі ў эканоміцы не такія відавочныя, — зберажэннямі трэба проста правільна кіраваць. Як гэта рабіць — тут кожны выбірае свой алгарытм.**

### Услед за стаўкай рэфінансавання

Самае галоўнае, што ўплывае на фінансавую стабільнасць нашага рынку — гэта змяненне стаўкі рэфінансавання ў бок зніжэння. Летась яна працягвала паніжацца і два разы скарачалася на 0,5 % гадавых. У лістападзе спынілася на адзнацы 9 % гадавых.

Характэрна, што стаўкі па дэпазітах у беларускіх рублях тэрмінам да 35 дзён засталіся тыя ж, што і ў пачатку мінулага года. Практычна ва ўсіх банках стаўкі па такіх дэпазітах засталіся на тым жа ўзроўні, што і стаўка рэфінансавання Нацбанка. Варта таксама адзначыць, што на працягу года некаторыя банкі вырашылі выключыць з дэпазітных лінеек уклады на месяц. Як альтэрнатыва былі прапанаваны стаўкі на два месяцы або на паўтара.

Найбольш выгадна размяшчаць дэпазіты на год у нацыянальнай валюце было ў маі — ліпені. Тады стаўкі па такіх укладах на год былі максімальна высокія — 12,98 % гадавых. У ліпені стаўкі пачалі зніжацца і дасягнулі лічбы 12,7 % гадавых у лістападзе. Зараз максімальная гадавая даходнасць рубля яшчэ ўпала — у першыя дні новага года яна была роўная 12,51 %. А сярэдняя стаўка ўсіх банкаў па доўгіх рублёвых дэпазітах склала 12,1 %.

Што датычыцца ўкладаў тэрмінам на два і на тры гады, то тут дынаміка больш нагадвае бег па крузе. Калі ў пачатку года стаўка па супердоўгіх грошах складала 12,5 % гадавых, у чэрвені — ліпені павялічылася да 13,5 %, то ў снежні абвалілася да 12 % гадавых. У пачатку студзеня каціроўка такіх ставак застаецца без змен.

### Пра валютны кошык

Пасля таго як на доўгатэрміновай перспектыве стала мацнець валюта нашай найбліжэйшай суседкі, у сегменце ўкладаў у замежнай валюце найбольшай актыўнасцю можа пахваліцца расійскі рубель. Летась шматлікія беларускія банкі, якія не працавалі з укладамі ў расійскіх рублях, вырашылі стварыць такія прадукты. На працягу года стаўка па розных укладах вагалася ў раёне 6,5 — 7,5 % гадавых. Пры гэтым да канца мінулага года ўкладаў са стаўкай вышэй за 7 % гадавых практычна не засталося. Тым не менш стаўкі па доўгіх дэпазітах у гэтай валюце тэрмінам на два гады не змяніліся.

Што датычыцца доларавага сегмента, то летась практычна кожны месяц знаходзіліся банкі, якія зніжалі стаўкі. Самая высокая стаўка па гадавым дэпазіце у 2019-м была зафіксаваная ў лютым — красавіку — ад 3 да 3,2 % гадавых. Цяпер па ўкладах на тэрмін да года доларавая даходнасць спынілася на 1,8—2 % гадавых. На доўгую дыстанцыю долар на працягу года спрацаваў не лепш: ад 3,5 % гадавых у пачатку года да 2,5 % — у канцы. І гэта самыя выгадныя варыянты па дэпазітах на два і тры гады.

У сегменце еўра стаўкі практычна не мяняліся. Самая выгадная стаўка на пачатак года — 2,2 % гадавых, на канец года — 1,8 % гадавых. Нядрэнная гісторыя і з укладамі на два і тры гады. За год па ўкладах на два гады еўра страціў 0,2 % гадавых па самай выгаднай стаўцы, а па ўкладах на тры гады — 0,5 % гадавых.

Зрэшты, эксперты рэкамендуюць «не захоўваць усе яйкі ў адным кошыку», таму калі вы — шчаслівы ўладальнік вялікіх зберажэнняў, дыверсіфікуйце свае рызыкі і выбірайце розныя інструменты і розныя банкаўскія ўклады. А для большай бяспекі лепш загадзя прадбачыць, колькі ж будуць каштаваць долар і еўра праз год.

Фінансавы аналітык Вадзім Іосуб прагназуе, што інфляцыя, хутчэй за ўсё, будзе расці на прагнозных узроўнях, гэта значыць на 5 % за 2020 год. На столькі ж можа вырасці і валютны кошык. І калі выказаць здагадку, што курс замежных валют на замежных рынках, гэта значыць еўра да долара, долара да расійскага рубля, моцна не зменіцца, то ў гэтым выпадку рост кошыка на 5 % будзе азначаць рост кожнай валюты на 5 %. У выніку долар можа вырасці да канца года да 2,21 беларускага рубля, еўра — да 2,47 беларускага рубля, а расійскі рубель можа падаражэць да 3,57 беларускага рубля за 100 расійскіх.

### У рублях на 12 % больш

Мы ўдакладнілі, што за мінулы год наш рубель умацаваўся да долара на 2,6 %. Гэта значыць, што стабільнасць «амерыканца» моцна перабольшаная, ці што ён першапачаткова быў пераацэнены? Не так важна, хоць... Галоўнае, што тыя беларусы, хто не пабаяўся пакласці свае кроўныя зберажэнні на год у банк у нацыянальнай валюце, у выніку атрымалі абарону ад падаражання тавараў і паслуг у памеры плюс 7 % (стаўка дэпазіту 12 % мінус 5 % інфляцыі) і значна большы даход у пераліку на долары.

Бо тыя, хто захоўваў грошы ў амерыканскай валюце і атрымліваў даход у сярэднім 2,5 % гадавых, пры зваротнай канвертацыі выходзіць у нуль рублёў меркаванага даходу. Пры такім варыянце захавання зберажэнняў кліент банка не атрымлівае нават абарону ад інфляцыі (2,5 % мінус 5 %), а тут яшчэ патанненне валюты (мінус 2,6 %). Як ні круці, а па выніках года рублёвыя дэпазіты былі выгаднейшыя за валютныя ўклады больш чым на 10 %. Ну што ж, прыклад таго, што выйграе той, хто ставіць на свой родны рубель.

**Сяргей КУРКАЧ.**

## ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

### Сусветны банк чакае зніжэння цаны на нафту



Сусветны банк (СБ) агучыў прагноз па зніжэнні сярэдняй цаны на нафту ў 2020 і 2021 гадах, паведамляе ТАСС. Эксперты ўпэўнены, што кошт сыравіны ў сярэднім не будзе перавышаць 59 долараў за бараль, адзначаецца ў дакладзе СБ за студзень «Перспектывы развіцця сусветнай эканомікі». Паводле прагнозаў Сусветнага банка, на фоне зніжэння цаны на «чорнае золата» «працягнуць павялічвацца аб'ёмы здабычы нафты ў ЗША па меры будаўніцтва новых трубаправодаў». Аднак аўтары даклада ўпэўненыя, што сярод фактараў, здольных павысіць цэны на нафту, знаходзіцца магчымае «зніжэнне гандлёвай напружанасці паміж ЗША і Кітаем». У арганізацыі растлумачылі, што гаворка ідзе пра простую сярэднеарыфметычную цану на сыравіну гатункаў Brent, Dubai і WTI.

### Харватыя ўзначаліла Еўрасаюз

Харватыя адкрыла новы год пачаткам свайго старшынства ў Савеце Еўрасаюза — гэты мандат балканскай дзяржавы дзейнічае да 30 чэрвеня. Ён прадугледжвае, што кіраўнік урада будзе весці пасяджэнні еўрапейскага савета ў Брусэлі і ў Люксембургу, а таксама праводзіць неафармальныя сустрэчы міністраў краін ЕС у Заграбе. Рэспубліка займае гэтую пасаду ўпершыню і ў перыяд змен для ЕС, звязаных з «брэксітам». Урачыстая цырымонія ўступлення краіны ў старшынства прайшла ў харвацкай сталіцы. На ёй прэм'ер-міністр Харватыі Андрэй Пленкавіч заявіў, што для краіны «старшынства ў Еўрасаюзе — вельмі важны момант, звязаны з завяршэннем гістарычнага цыкла, які пачаўся са здабыцця незалежнасці і вяртання да агульнаеўрапейскіх каштоўнасцяў». Харватыя абрала дэвіз свайго старшынства: «Моцная Еўропа ў няпростым свеце». У праграме мандата ў Савеце ЕС краіна адзначае, што Стары Свет мае патрэбу ў вырашэнні задач далейшага эканамічнага развіцця, ліквідацыі надзвычайнай кліматычнай сітуацыі, урэгулявання міграцыі, барацьбы супраць дэзінфармацыі і папулізму. Пасада краіны-старшыні ў ЕС — ратацыйная, праз паўгода Харватыю зменіць Германія.



### Шкода ад стыхійных бедстваў склала 150 мільярдаў долараў

Сукупная шкода, якую стыхійныя бедствы і антрапагенныя катастрофы нанеслі сусветнай эканоміцы летась, склала каля 150 мільярдаў долараў, сведчаць звесткі нямецкай перастраховачнай кампаніі, аднаго з лідараў глабальнага страхавога рынку Munich Re. Гэта прыблізна супадае з сярэднім паказчыкам за апошнія 30 гадоў з папраўкай на інфляцыю. У 2018 годзе шкода склала $186 млрд, а максімум у $354 млрд быў зафіксаваны ў 2011 годзе і звязаны з землетрасеннем «Тахоку» ў Японіі. З агульнага аб'ёму страт было застрахавана ўсяго крыху больш за траціну — на $52 млрд. Гэта абумоўлена, у тым ліку, значнай шкодай ад паводак, страхаванне ад якіх не так шырока распаўсюджанае ў большасці прамысловых краін, як ад рызык, звязаных з ураганамі. Летась у свеце адбылося 820 прыродных катастроф, у выніку якіх загінула каля дзевяці тысяч чалавек. У 2018-м 850 бедстваў забралі жыцці 15 тысяч чалавек. Сярэдні паказчык за дзесяць гадоў складае 660 катастроф і 37,4 тысячы загінулых штогод, за трыццаць гадоў — 520 і 51,6 тысячы. Найбольш істотны ўрон эканоміцы летась нанеслі два тайфуны, які пранесліся па тэрыторыі Японіі восенню, «Хагібіс» і «Факсай» — адпаведна на $17 млрд і $9,1 млрд. Наступны па памеры нанесенай шкоды тайфун «Лекіма», які бушаваў у Азіі ў жніўні ($8,1 млрд), а таксама паводкі летам у Індыі ($7 млрд) і ў Кітаі ($6,2 млрд). Аднак доля застрахаванай уласнасці ў гэтых краінах невялікая, таму па памеры страхавых іскаў пазіцыі з трэцяй да пятай у 2019 годзе занялі ўраган «Дорыян» і штормы ў ЗША ў маі і кастрычніку.



# РЭКОРДНЫ, МЕДАЛЬНЫ, НАСЫЧАНЫ

## Лёгкаатлеты падвялі вынікі сезона

**Ужо традыцыйным мерапрыемствам у спартыўнай супольнасці ў пачатку года стала цырымонія ўзнагароджання найлепшых лёгкаатлетаў і трэнераў краіны «Атлетыка». У першыя студзеньскія дні ўсе прыкметныя асобы беларускай лёгкай атлетыкі збіраюцца ў адным месцы, каб падвесці вынікі, павіншаваць адно аднаго з завяршэннем сезона і натхніцца на новыя здзяйсненні ў наступным. А на цяперашняй цырымоніі абмеркаваць сапраўды было што, бо сезон выдаўся вельмі насычаны — гэта і дамашнія Еўрапейскія гульні, і камандны чэмпіянат Еўропы, і матчавая сустрэча Еўропа — ЗША, і чэмпіянат свету, які завяршыў сезон лёгкаатлетаў. 2020 год стане яшчэ больш напружаным, бо спартсменаў чакае галоўнае выпрабаванне — Алімпіяда. Многія з іх ужо ў прадчуванні.**



Карына ДЗЯМІДЗІК.



Максім НЕДАСЕКАЎ з міністрам спорту і турызму краіны Сяргеем КАВАЛЬЧУКОМ.

**Старшыня Беларускай федэрацыі лёгкай атлетыкі Вадзім ДЗЕВЯТОЎСКІ** адзначыў, што сезон-2019 сапраўды быў доўгі і ў нейкім сэнсе нават стамляючы, але спартсмены гэта вытрымалі і прайшлі яго з годнасцю. Таксама ён падзякаваў усім, хто падтрымлівае гэтыя віды спорту ў Беларусі, і адзначыў, што выбраць найлепшых спартсменаў было вельмі складана. *«Для мяне заўсёды было прынцыповым момантам зрабіць галасаванне і выбар лаўрэатаў «Атлетыкі» максімальна сумленнымі. Гэта як на Алімпіядзе — удзельнічаюць найлепшыя, самыя моцныя, але чэмпіёнам у выніку становіцца толькі адзін з іх. Астатнім застаецца толькі павіншаваць яго і спытаць сябе: «Што я магу зрабіць, каб наступны раз быць першым?»*



Анастасія МІРОНЧЫК-ІВАНОВА з мужам і трэнерам.

Перад абвяшчэннем імён пераможцаў арганізатары ўспомнілі самыя яркія моманты года, гучныя перамогі і крыху засумавалі, ушанаваўшы памяць тых, каго ў 2019 годзе з намі не стала.

Сапраўдным трыумфатарам «Атлетыкі» сёлета прызнаны скакун у вышыню Максім Недасекаў, які выйграў адразу дзве статуэткі, стаўшы найлепшым і сярод дарослых, і сярод маладых спартсменаў. *«Я марыў пра гэта!»* — адзначыў Максім і, каб падзякаваць, запрасіў на сцэну сваіх трэнераў Тацццяну Нарэйку і Уладзіміра Полагава.

Сярод жанчын найлепшай спартсменкай года стала кідальніца кап'я Таццяна Халадовіч. Нагадаем, на II Еўрапейскіх гульнях яна адправіла снарад на 67,22 м, гэта другі вынік мінулага сезона сярод спартсменак з Еўропы і чацвёрты ў свеце. Найлепшай сярод жанчын у намінацыі «Моладзь» была прызнана Карына Дзямідзік (скачкі ў вышыню).

У катэгорыі «Юніёры» найлепшымі сталі Аліна Лучшава (бег на 400 м) і Мікіта Каляда (спартыўная хадзьба), у катэгорыі «Юнакі» — Лізавета Грышкевіч (спартыўная хадзьба) і Раман Хартановіч (кіданне дыска). Намінацыяй «Характар года» адзначана Аліна Лучшава, якая гераічным спуртам прынесла беларускай эстафеце 4х400 метраў «серабро» юніёрскага чэмпіянату Еўропы і абнавіла рэкорд краіны ў катэгорыі U-20. Пераможцам намінацыі «Учынак года» стаў Віталь Жук, які падчас спаборніцтваў шматборцаў на чэмпіянаце свету аддаў свой шост Ілью Шкуранёву, што выступаў пад нейтральным сцягам. «Адкрыццём года» сталі скакун у вышыню Ягор Гуптар і бягуння Кацярына Масюк. У намінацыі «Прарыў года» адзначаныя Карына Дзямідзік і кідальнік кап'я Аляксей Каткавец, які прабіўся ў фінал чэмпіянату свету ў Досе.

**Дар'я ЛАБАЖЭВІЧ.**
**Фота Ганны ЗАНКАВІЧ.**

Навука

# У БАНКУ ТАЛЕНТАЎ НОВЫЯ ЛАЎРЭАТЫ

**Аб'яўлены лаўрэаты конкурсу «100 талентаў Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі» за 2019 год. У іх ліку — 10 маладых навукоўцаў.**

Сярод лаўрэатаў намеснік загадчыка цэнтра «Фізіка плазмы» Інстытута фізікі імя Б. І. Сцяпанава, кандыдат фізіка-матэматычных навук Максім УСАЧОНАК; вядучы навуковы супрацоўнік лабараторыі фізікі магнітных плёнак Навукова-практычнага цэнтра НАН па матэрыялазнаўстве, кандыдат фізіка-матэматычных навук Аляксей ТРУХАНАЎ; старшы навуковы супрацоўнік аддзела крыягенных даследаванняў Навукова-практычнага цэнтра па матэрыялазнаўстве, кандыдат фізіка-матэматычных навук Дзмітрый ЯКІМЧУК; старшы навуковы супрацоўнік лабараторыі бялковай інжынерыі Інстытута біяарганічнай хіміі, кандыдат хімічных навук Яраслаў ДЗЯЧЭНКА; дырэктар Інстытута прыродакарыстання Нацыянальнай акадэміі навук, доктар фізіка-матэматычных навук Сяргей ЛЫСЕНКА; вучоны сакратар Навукова-практычнага цэнтра па біярэсурсах, кандыдат біялагічных навук Марына ШАБЕТА; старшы навуковы супрацоўнік шматпрофільнай дыягнастычнай лабараторыі Інстытута фізіялогіі НАН, кандыдат біялагічных навук Тацццяна ХРУСТАЛЁВА; старшы навуковы супрацоўнік аддзела найноўшай гісторыі Беларусі Інстытута гісторыі, кандыдат гістарычных навук Аляксей КАПЛІЕЎ; загадчык сектара кааперацыі Інстытута сістэмных даследаванняў у АПК, кандыдат эканамічных навук Ягор ГУСАКОЎ і старшы навуковы супрацоўнік аддзела тэхналогій мясных прадуктаў Інстытута мяса-малочнай прамысловасці НПЦ НАН па харчаванні, кандыдат тэхнічных навук Ірына КАЛТОВІЧ.

Конкурс «100 талентаў Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі» ўпершыню праводзіўся ў 2018 годзе. Ён мае на мэце замацаванне таленавітай моладзі ў навуковай, навукова-тэхнічнай і інавацыйнай сферах, стварэнне маладзёжных навукова-даследчых груп і амаладжэнне кадравага складу навуковых арганізацый НАН Беларусі, забеспячэнне пераемнасці паміж вучонымі розных пакаленняў.

У конкурсе могуць прымаць удзел маладыя навукоўцы НАН Беларусі, якія абаранілі кандыдацкую дысертацыю ва ўзросце да 30 гадоў або атрымалі навуковую ступень доктара навук ва ўзросце да 40 гадоў. Лаўрэаты ўключаюцца ў банк даных «100 талентаў Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі» з выдачай адпаведнага сертыфіката і ў рэзерв кіруючых кадраў НАН Беларусі. Акрамя таго, яны атрымліваюць адназразовы грант на ўдзел у міжнародным навуковым мерапрыемстве на працягу аднаго каляндарнага года з моманту абвяшчэння вынікаў конкурсу. Пры ўмове здавальняючай ацэнкі гадавой справаздачы аб навукова-даследчай, педагагічнай і інавацыйнай дзейнасці лаўрэатам конкурсу выплачваецца штогадовая прэмія ў памеры да 50 базавых велічынь у перыяд уваходжання ў банк даных «100 талентаў Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі». Кандыдаты навук могуць знаходзіцца ў банку да 35-гадовага ўзросту, дактары навук — да 45 гадоў.

Агульная колькасць маладых навукоўцаў, якія адначасова ўваходзяць у банк даных «100 талентаў Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі», не можа перавышаць 100 чалавек, а штогадовая колькасць лаўрэатаў конкурсу — не больш за 20 чалавек.

**Надзея НІКАЛАЕВА.**

КРЫМІНАЛ ЗДАРЭННІ КРЫМІНАЛ ЗДАРЭННІ

## ЗЛАДЗІЛІ КЛІЕНТАМ «ХАЛОДНЫ ДУШ»

**У Фрунзенскае РУУС Мінска паступіла больш за 60 заяў ад грамадзян, якія не дачакаліся выканання абавязацельстваў ад прадпрыемства ПУП «Альберыум Лад» па вырабе лазняў.**

Паводле аператыўнай інфармацыі, мінчанін і гамяльчанін у 2018 годзе стварылі сайт у інтэрнэце, аналагічны вядомаму расійскаму брэнду. Яны пазіцыянавалі сябе яго афіцыйным дылерам на тэрыторыі Беларусі, прапануючы пастаўку лазняў з Расіі коштам ад 6 да 24 тысяч долараў.

Усе заказы прымаліся з поўнай або частковай перадаплатай. У самым пачатку сваёй дзейнасці і аж да сакавіка 2019 года прадпрыемства заказы выконвала. А затым перастала, але замовы ад кліентаў пры гэтым прымаць працягнула. У выніку такой дзейнасці пацярпелым нанесены ўрон на суму 400 тысяч рублёў. Вядома, што раней мужчыны да крымінальнай адказнасці не прыцягваліся.

ГУУС Мінгарвыканкама звяртаецца да грамадзян, якія пацярпелі ад іх супрацьпраўных дзеянняў, з просьбай паведаміць пра гэта ў праваахоўныя органы па тэлефонах: 8 (017) 389 55 55, 8 (029) 241 78 58, 102.

## НЯБОЖЧЫК ЗА... СВЯТОЧНЫМ СТАЛОМ

**У міліцыю звярнулася жыхарка вёскі Чарасы Мёрскага раёна: знік муж. Па словах жанчыны, ён ужо некалькі дзён не з'яўляўся і не начаваў дома.**

Як высветлілі праваахоўнікі, апошні раз яго бачылі ў гасцях у аднавяскоўца-рамесніка, які нядаўна вярнуўся з Расіі. Падчас праверкі гэтай інфармацыі супрацоўнікамі крымінальнага вышуку Мёрскага РАУС зніклы быў знойдзены. Яго труп знаходзіўся ў... крэсле за сталом, дзе некалькі дзён ішло бурнае застолле, паведамляе аддзяленне інфармацыі і грамадскіх сувязяў УУС Віцебскага аблвыканкама.

Як паказала экспертыза, у загінулага мужчыны 1969 года нараджэння мелася драпіна на галаве, ад якой, як мяркуецца, ён і памёр. Уладальнік дома прызнаўся, што нанёс яму ўдар паленам падчас сваркі. З-за апранутага на галаву забітага капюшона вясковец не адразу звярнуў увагу на здарэнне і працягнуў п'янстваваць. Пазней, як прызнаўся мужчына ў гутарцы з міліцыянерамі, у яго ўзніклі падазрэнні, што з госцем не ўсё ў парадку. У дачыненні да падазраванага 1966 года нараджэння заведзена крымінальная справа.

## СКРАЛА СУМКУ

### Падабраўшы ключ да камеры захоўвання

**У Партызанскі РУУС Мінска па дапамогу звярнулася 69-гадовая жыхарка сталіцы. Жанчына паведаміла, што ў яе была выкрадзена сумка, пакінутая ў ячэйцы для захоўвання рэчаў у краме на вуліцы Першамайскай.**

Праваахоўнікі, правёўшы аператыўна-вышуковыя мерапрыемствы, устанавілі, што датычная да крадзяжу сумкі аказалася 75-гадовая мінчанка, якая раней ужо неаднаразова прыцягвалася да адміністрацыйнай адказнасці за ўчыненне дробных крадзяжоў з розных крам сталіцы.

ГУУС Мінгарвыканкама паведамляе, што ў дзень знікнення маёмасці заяўніцы пажылая мінчанка таксама наведвала вышэйназваную краму, дзе ў ячэйцы пакідала і свае рэчы. Здзейсніўшы пакупкі, зламысніца накіравалася да камер захоўвання, дзе спачатку забрала сваю маёмасць, а пасля з выкарыстаннем ключа паспрабавала адкрыць і іншыя ячэйкі. Да адной з іх ключ падышоў: забраўшы чужую сумку, мінчанка хутка пакінула краму.

Устаноўлена, што выкрадзеную маёмасць жанчына захоўвала ў сябе ў кватэры. Сумка з усім змесцівам была канфіскавана.

## «ПАЗЫЧАЛА» ГРОШЫ З КАСЫ ЛАМБАРДА

**У Баранавіцкі ГУУС звярнуўся ўласнік ламбарда і заявіў пра знікненне буйной сумы грошай.**

Супрацоўнікі АБЭЗ высветлілі, што да гэтага датычная 33-гадовая супрацоўніца ламбарда, мясцовая жыхарка. На працягу двух гадоў яна выкрадала грошы з касы.

Агулам жанчына вынесла каля 4000 рублёў, паведамляе УУС Брэсцкага аблвыканкама. Фігурантка растлумачыла праваахоўнікам, што грошы траціла на вяртанне даўгоў і ўласныя патрэбы.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

Гучная справа

# У Чэрыкаве вынеслі прысуд забойцам настаўніцы

**Фігурантаў рэзананснай справы братоў Косцевых прыгаварылі да найвышэйшай меры пакарання.**

Такое рашэнне прыняў выязны абласны суд. На такой меры настойваў і дзяржабвінаваўца. Нагадаем падрабязнасці жудаснай трагедыі. Для правінцыйнага Чэрыкава тое, што здарылася 10 красавіка ў доме на вуліцы Гагарына, стала вялікім узрушэннем. Падчас пажару ў доме было знойдзена цела 47-гадовай жанчыны са шматлікімі нажавымі раненнямі. Як потым высветлілася, ахвярай стала мясцовая настаўніца-дэфектолаг Наталля Кастрыца. А хутка затрымалі і тых, каго падазравалі ў гэтым бесчалавечным злачынстве, — братоў Косцевых 1998 і 2000 гадоў нараджэння. На допыце яны расказалі, што настаўніца паведаміла мясцовым органам улады пра іх сястру, якая не выконвае належным чынам бацькоўскія абавязкі па выхаванні малалетніх дзяцей. Сям'ю прызналі сацыяльна небяспечнай і паставілі на прафілактычны ўлік. Браты вырашылі «заступіцца» за сястру і «пагутарыць» з настаўніцай. Перад тым як адправіцца на «перамовы», яны выпілі.

Па інфармацыі следства, маладыя хлопцы здзекаваліся з жанчыны амаль усю ноч. Спачатку збівалі, а потым сталі рэзаць яе цела. Як было ўстаноўлена, жанчына атрымала больш за 130 удараў нажом, у тым ліку ў жыццёва важныя органы. А яе смерць надышла ад гемарагічнага шоку. Каб схаваць сляды, забойцы падпалілі дом, але перад гэтым не пагрэбавалі прыхапіць з сабой чужыя рэчы. Пры вобыску ў іх доме быў знойдзены скрадзены з месца злачынства ноўтбук.

На нядаўняй сустрэчы з расійскім журналістам Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка згадаў гэты жудасны выпадак як абуральны прыклад паводзін асацыяльных элементаў, што страцілі ўсякі страх, і іх непасрэднай пагрозы для грамадства.

Насамрэч патлумачыць, як зразумець паводзіны гэтых маладых людзей, немагчыма. У зале суда яны сцвярджалі, што не жадалі даходзіць да такой мяжы, прасілі суд не быць да іх вельмі жорсткім. Але маці, муж і сын забітай палічылі, што зло павінна быць пакарана. «Хто мне верне дачку?» — пыталася несуцешная маці. У дзень забойства настаўніцы нікога з родных побач з ёй не аказалася. Яе сын быў на вучобе ў Мінску, а муж — у Расіі.

**Нэлі ЗІГУЛЯ.**

# НЕ ПРАПАСЦІ БЕЗ ПАРЫ

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Скупым радком афіцыйнай інфармацыі гэта выглядала так: ранкам 1 студзеня ў названай вёсцы падчас тушэння пажару супрацоўнікі МНС знайшлі целы трох мужчын: двое ва ўзросце 52 гадоў, аднаму было 44 гады. Яны разам адзначалі Новы год.

Пасядзелі, называецца, — і траіх жыхароў адной вёскі ў актыўным узросце як не было. У сельскім Савеце расказалі, што двое з той нешчаслівай тройцы працавалі, але ніводзін не меў сям'і. Двое раней былі жанатыя, ды не захавалі сямейных стасункаў, трэці наогул ніколі не браў шлюб. Ну што рабіць вясковым халасцякам у святочны дзень, калі іх трое? Прыдбаць гарэлкі і закускі ды наладзіць хлапечнік. Так і зрабілі, сабраліся ў непрацуючага сябрука. І хоць пакуль афіцыйныя органы не паведамілі прычыну пажару, які ўзнік у доме 52-гадовага гаспадара, няцяжка здагадацца, як развіваліся падзеі. Нехта з кампаніі закурыў, іншыя знахозіліся ў стадзі глыбокага сну і не адрэагавалі своечасова на пах дыму. Калі суседзі заўважылі гарэнне і выклікалі падраздзяленне ратавальнікаў, агонь бушаваў на ўсю моц. Сведчаннем таму рэшткі жылой пабудовы. Ад хаты фактычна нічога не засталося.

Каб кожны з іх сустракаў Новы год ва ўласнай сям'і, верагоднасць блізкая да ста працэнтаў, што мужчыны былі б жывыя і здаровыя. Нават не кажу пра 44-гадовага, але і тыя, каму крыху за 50, пры іншым раскладзе маглі б ствараць новую сям'ю, наладзіць жыццё. Толькі вось прычына, па якой і з першай не склалася, нікуды не дзелася. П'янства разбурае сем'і і прыводзіць да заўчаснай смерці добрую частку прадстаўнікоў моцнага полу.

## У ПОШУКАХ АДРЭНАЛІНУ

Нядаўна чытала развагі аднаго ветэрана ўзброеных сіл суседняй краіны. Ён напісаў так: «Міжнародная алкагольная мафія ставіць мэтай знішчыць наш народ без вайны». Ні больш, не менш. Некалькі разоў згадвала аб гэтым, разважала. Але ж тая самая мафія, калі яна ёсць наогул, нікому сілком у рот спіртное не залівала. Кожны п'е па сваёй волі і за свае грошы. Пры тым, што кожны хоць бы ў агульных рысах ведае аб наступствах гэтай заганнай прывычкі. Што ж тут наракаць на мафію, калі нават пры даволі строгіх законах як у нашай, так і іншых краінах, на дарогах па-ранейшаму выяўляюць нямала п'яных за рулём.

Людзі бяруцца кіраваць машынай часам на добрым падпітку, бывае, гінуць самі або, што яшчэ горш, забіваюць іншых. Да гэтай пары не забываецца дарожнае здарэнне ў Брэсцкім раёне, сведкай якога давялося быць паўтара года таму. У аўтобус, які вёз дэпутатаў абласавета на выязную сесію, на ўсёй хуткасці ўляцеў легкавік. Машыну вынесла на ўзбочыну і перакуліла некалькі разоў. Старэнькая іншамарка круцілася, нібы цацка ў анімацыйным фільме, і ўпала на дах уверх коламі. Кіроўцу выратавала тое, што машына падала і пераварочвалася па свежай раллі, поле нядаўна ўзаралі пасля ўборкі збожжавых. Аказалася, за рулём сядзеў малады чалавек, пазбаўлены правоў за нецвярозае кіраванне. Машына была такая пакарабачаная, што аднаўленню наўрад ці падлягала, а ён выбраўся з яе самастойна. У кашулі нарадзіўся — гаварылі шматлікія сведкі здарэння. Але так бывае далёка не з усімі.



Дарэчы, аварыі — таксама нярэдкая прычына страты нашых існых і патэнцыяльных бацькоў сямействаў. Пад Брэстам 31 студзеня загінуў 26-гадовы хлопец. На аўтамабілі «Аўдзі» ён уляцеў у паўпрычэп велікагруза, які стаяў на ўзбочыне. Ад машыны засталася груда металу і пластыку. А на выдзертым з мясам спідометры назаўсёды застыла стрэлка з адзнакай 140 кіламетраў. Куды спяшаўся? — рытарычнае пытанне. І гэта, на жаль, не максімальная мяжа хуткасці, якую перавышаюць нашы, асабліва маладыя, кіроўцы. Вучачь іх вучаць у аўташколах, камеры паўсюль стаяць на той жа трасе М1, дзе адбылася згаданая аварыя, а яны ўсё роўна шукаюць адрэналіну, ціснуць на газ ды адчуваюць асалоду ад хуткай язды... У выніку толькі адной аварыі грамадства пазбавілася маладога і перспектыўнага працаўніка і сямейніка, а родным назаўсёды дасталася гора ад страты.

## ВОРАГ-СТРЭС

Ну і яшчэ адна праблема, пра якую нельга не гаварыць. Перажыванні, стрэсы, незадаволенасць жыццём прыводзяць да розных захворванняў, а нярэдка да самагубства. Толькі адна паралельная лічба: жанчыны ў Беларусі накладваюць на сябе рукі прыкладна ў пяць разоў радзей, чым мужчыны. Тут ужо час гвалт крычаць. Вось вам адна з карцінак жыцця, бяда напаткала далёкіх сваякоў маіх знаёмых. Хлопец жыў у адным з невялікіх райцэнтраў, тым з іх, якія цяпер часам называюць дэпрэсіўнымі з-за напружанай сітуацыі на рынку працы, адсутнасці перспектыўных працадаўцаў. Меў ён сярэднюю спецыяльную адукацыю. Працаваў то ў адным, то ў другім месцы, з-за некаторых праблем са здароўем цяжкую работу, напрыклад на будоўлі, не мог выконваць. Але ж аднаму хапала, жыў у кватэры бацькоў. Калі ажаніўся, паявілася дзіця, паўстала пытанне аб уласным жыллі. Жонка настойвала браць крэдыт, ён не адважваўся, бо не меў упэўненасці ва ўласнай платежаздольнасці. Жылі па-ранейшаму ў яго бацькоў. Паразуменне нявестка са свякроўкай не асабліва знаходзілі, але абедзве яго перыядычна пілавалі. Стаў выпіваць — найбольш каб зняць стрэс. А калі жонка заявіла, што яе цярпенне скончылася, яна з'язджае да сваіх бацькоў, яго знайшлі ў гаражы. У запісцы прасіў прабачэння, прасіў нікога не вінаваціць. Выпадак па цяперашнім часе дык ледзь не тыповы. «Але ж так быць не павінна!» — скажаце вы. І я пагаджуся, бо выйсця няма толькі з-пад вечка труны, у астатніх выпадках яно, як быццам, ёсць! Вось і тут можна было паспрабаваць нейкую ўласную справу, альбо пашукаць заробкаў не пабач з домам. Але хіба з ім пра гэта гаварылі родныя жанчыны? А калі гаварылі, то чаму ён іх не пачуў? Выходзіць, кволы, уразлівы ўнутраны стрыжань у сучаснага пакалення галоў сямей, безабароннасць перад любымі жыццёвымі выпрабаваннямі... І нават у таго, хто не вырашае пытанне вось так радыкальна, як той жыхар райцэнтра, стрэс назапашваецца, нярэдка выбухае інфарктамі, інсультамі, іншымі немачамі. А да доктара нашы бацькі сямействаў часам прыходзяць, калі жонка ледзь не сілком прывалача. У каго няма жонкі, той яшчэ пазней трапіць у медустанову. Вось вам і няўмольная статыстыка.

Скажаце, нічога новага не сказала. Усё гэта мы даўно ведаем. Правільна, ведаем, але ж ці нагода — ведаць, сядзець і маўчаць ў анучку. Трэба хоць гаварыць, каб бацькі думалі над гэтым і размаўлялі ў сем'ях, асабліва з хлопчыкамі-падлеткамі, абмяркоўвалі гэту тэму, вучылі дзяцей берагчы здароўе. Не заўсёды, праўда, навука падае на жыватворчую глебу, але ж спрабаваць трэба. Сказана ж, стукайце, і вам адкрыецца. А што яшчэ застаецца? Хіба толькі вось... Як пісала гэтыя радкі, зайшоў калега, пацікавіўся над чым працую, калі адказала, вымавіў не без іроніі, але з пэўным выклікам: «Мала вы, жанчыны, любіце сваіх мужыкоў, вось мы і прападаем без пары». Спрачацца не стала, але гэта ўжо, як кажа вядучы адной тэлеперадачы, зусім іншая гісторыя.

**Святлана ЯСКЕВІЧ.**


## Открытый аукцион № 01/20 по продаже офисных помещений по адресу: г. Минск, ул. Ваупшасова, 10

**Организатор аукциона:** ООО «Реалконсалтинг», адрес: ул. Пономаренко, 35А, пом. 701, каб. 8. г. Минск, 220015, Республика Беларусь, телефон/факс: + 375 (17) 256-61-35

**Аукцион состоится 12.02.2020 в 11.00, по адресу: г. Минск, ул. Пономаренко, 35А, пом. 701. Продавец** – СООО «РЕСО-БелЛизинг»

| № лота | Предмет аукциона | Местонахождение | Площадь, кв. м | Начальная цена продажи долл. США с учетом НДС * | Сумма задатка по лоту, руб. |
|---|---|---|---|---|---|
| 1 | Административное помещение с инвентарным номером 500/D-708127293 (назначение – административное помещение, наименование – административное помещение). **ОФИС** | **г. Минск, ул. Ваупшасова, 10–159** | 177,5 | **106 500** | 8000 |
| 2 | Административное помещение с инвентарным номером 500/D-708127294 (назначение – административное помещение, наименование – административное помещение). **ОФИС** | **г. Минск, ул. Ваупшасова, 10–160** | 128,3 | **76 980** | 6000 |

* расчеты за приобретаемое имущество производятся в белорусских рублях по курсу НБ РБ на дату заключения договора купли-продажи

| | |
|---|---|
| **Порядок проведения и выбора победителя** | Открытый аукцион на повышение начальной цены проводится с шагом аукциона в размере **5 процентов** от начальной стоимости предмета аукциона. Победителем объявляется участник аукциона, предложивший наиболее высокую цену. В случае если в аукционе примет участие один участник либо на аукцион явится один участник (далее единственный участник), предмет аукциона продается этому участнику по начальной цене, увеличенной на 5 процентов, с его согласия |
| **Прием заявлений** | Заявления на участие в аукционе принимаются в рабочие дни с 9.00 до 18.00 по адресу: г. Минск, ул. Пономаренко, 35А, пом. 701, каб. 8. **Последний день приема заявлений: 07.02.2020 до 17.00** |
| **Задаток** | Для участия в аукционе необходимо внести задаток (задатки) в вышеуказанном размере (в случае участия в торгах в отношении нескольких лотов – задаток вносится для каждого из предметов аукциона). Банковские реквизиты:<br>– для резидентов РБ задаток перечисляется в белорусских рублях Организатору аукциона на расчетный счет BY70SLAN30124358100130000000 в ЗАО Банк ВТБ (Беларусь), г. Минск, ул. Московская, 14, БИК SLANBY22;<br>– для нерезидентов РБ задаток перечисляется в валютном эквиваленте по курсу НБ РБ на дату платежа на следующие счета: в долларах США (USD) – расчетный счет BY28SLAN30124358150210000000 в ЗАО Банк ВТБ (Беларусь), г. Минск, ул. Московская, 14, БИК SLANBY22. Получатель платежа: ООО «Реалконсалтинг», УНП 191302068.<br>Назначение платежа: «Задаток согласно Извещению о проведении аукциона № 01/20 по лоту №__» |
| **Затраты** | Возмещение затрат на организацию и проведение аукциона осуществляется победителем аукциона (единственным участником) по фактическим затратам, определенным в соответствии с Положением о порядке организации и проведения аукциона № 01/20. Победитель аукциона (единственный участник) обязан перечислить на текущий (расчетный) счет Организатора сумму затрат на организацию и проведение аукциона в белорусских рублях в течение 3 рабочих дней со дня его проведения |

1. Участнику, выигравшему аукцион, и единственному участнику сумма внесенного задатка учитывается в счет исполнения обязательств по договору, заключенному по результатам аукциона.
Участникам, не выигравшим аукцион, единственному участнику, не согласившемуся приобрести предмет аукциона по начальной цене, увеличенной на 5 процентов, задаток возвращается в течение 5 рабочих дней со дня проведения аукциона.
2. Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время, о чем Организатором аукциона извещаются участники аукциона.
3. Срок подписания договора купли-продажи предмета аукциона – в течение 20 дней со дня проведения аукциона. Срок оплаты предмета аукциона по договору купли-продажи – в течение 30 дней со дня проведения аукциона, если стороны договора не договорятся об ином сроке

**КОНТАКТНАЯ ИНФОРМАЦИЯ ОРГАНИЗАТОРА АУКЦИОНА**
+ 375 (17) 256-61-35 | + 375 (25) 549-86-22, Игорь Садливский,
**auction@expertiza.by.**
Более подробную информацию и фото по объекту возможно увидеть, посетив страницу http://www.expertiza.by

## ОБЪЯВЛЕНИЕ о повторных торгах

Государственное предприятие **«БелЮрОбеспечение»** (УНП 192821149) объявляет о проведении торгов: лот № 6.2020.01.00039: Ауди A8L, 2011 г. в., принадлежащий **Артемчик Е. М.,** находящийся в г. Бобруйске, начальной стоимостью 29 440,00 бел. руб.

**Торги будут проведены 30.01.2020 (9.00 – 18.00) на сайте e-auction.by.**

Задаток – 10 % от стоимости лота зачисляется до 16.00 29.01.2020 на счет ОПИ Бобруйского района, № BY10AKBB36429000023087100000, ф-л № 703 ОАО «АСБ Беларусбанк» г. Бобруйска, БИК AKBBBY21703, УНП 700014929.

Подробная информация размещена на сайте e-auction.by в разделе «Аукционы»

## ОБЪЯВЛЕНИЕ об электронных торгах

Государственное предприятие **«БелЮрОбеспечение»** (УНП 192821149) объявляет о проведении торгов: лот № 6.2020.01.00041: Пежо 407SW, 2009 г. в., принадлежащий **Ежову И. В.,** находящийся в г. Бобруйске, начальной стоимостью 8 500,00 бел. руб.

**Торги будут проведены 30.01.2020 (9.00 – 18.00) на сайте e-auction.by.**

Задаток – 10 % от стоимости лота зачисляется до 16.00 29.01.2020 на счет ОПИ Бобруйского района, № BY10AKBB36429000023087100000, ф-л № 703 ОАО «АСБ Беларусбанк» г. Бобруйска, БИК AKBBBY21703, УНП 700014929.

Подробная информация размещена на сайте e-auction.by в разделе «Аукционы»

## ОБЪЯВЛЕНИЕ об электронных торгах

Государственное предприятие **«БелЮрОбеспечение»** (УНП 192821149) объявляет о проведении торгов:

лот № 6.2020.01.00040: Rover 416, 1996 г. в., принадлежащий **Шмулевцову И. С.,** находящийся в г. Могилеве, начальной стоимостью 1100,00 бел. руб.

**Торги будут проведены 30.01.2020 (9.00 – 18.00) на сайте e-auction.by.**

Задаток – 10 процентов от стоимости лота зачисляется до 16.00 29.01.2020 на счет ОПИ Ленинского района, № BY65AKBB36429000054417000000, ф-л № 700 ОАО «АСБ Беларусбанк», г. Могилев, БИК AKBBBY21700, УНП 700014929.

Подробная информация размещена на сайте e-auction.by в разделе «Аукционы»

З нагоды

# АТН: ПЕРШЫЯ Ў ТЭЛЕЭФІРЫ

**Сёння Агенцтва тэлевізійных навін — гэта без перабольшвання брэнд якаснага эфірнага прадукту. Цяпер тут працуе каля 300 чалавек (а першапачаткова штат складаўся ўсяго з 15 супрацоўнікаў), сіламі якіх рыхтуюцца штодня выпускі навін, здымаюцца маштабныя спецпраекты, інфармацыйна-аналітычныя і цыклавыя праграмы, робяцца дакументальныя фільмы. Якія ж успаміны і адметныя эпізоды пакідае работа ў АТН у памяці тых, хто меў і мае дачыненне да стварэння разнастайных праектаў за 25 гадоў існавання гэтага падраздзялення Белтэлерадыёкампаніі.**



**Аляксандр МАРТЫНЕНКА, галоўны дырэктар тэлеканала «Беларусь 24»:**

— Калі я прыйшоў у Агенцтва тэленавін намеснікам галоўнага рэдактара, то ў нас было 3-4 аператары, некалькі журналістаў і пішучыя машынкі. Ні камп'ютараў, ні грымёраў, і ўсё, можна сказаць, даводзілася рабіць з нуля. То быў час, калі ў нас існаваў адзін беларускі канал, які глядзелі ўсе. І перад намі паставілі задачу зрабіць цікавыя, сучасныя праграмы навін, у той час як мяняліся тэлевізійныя пакаленні, школы і з'яўляліся новыя правілы гульні на інфармацыйным рынку. Такі быў пачатак... Я да прыходу на тэлебачанне працаваў на радыё, таму ўсё ж даводзілася перастройвацца, у многіх рэчах разбірацца і многаму вучыцца. Тады таксама мы не мелі і мабільных тэлефонаў, і як патрэбна было тэрмінова знайсці журналіста, то шукалі яго па стацыянарных тэлефонах, праз знаёмых. Асабліва складана было ў выхадныя дні. Памятаю, неяк склалася так, што на працягу тыдня, а то і болей я быў адзіным вядучым усіх выпускаў навін ад ранішніх да вынікова вага начнога і нават сам сябе грыміраваў. Безумоўна, пераглядаючы тыя выпускі, разумею, які быў няпросты час. Цяпер мы знаходзімся ў зусім іншых умовах. Успамінаецца і перыяд, калі ўсё пачало больш дынамічна змяняцца. Мяне тады прызначылі кіраўніком АТН, і мы з камандай стварылі і выбудавалі паўнавартасны замкнёны цыкл тэлевытворчасці, якой яна сёння і ёсць — ад здымак сюжэта, мантажу, графічнага афармлення і выдачы яго ў эфір. Зараз каманда Агенцтва тэлевізійных навін працуе ў самай сучаснай студыі і мае сучасную тэхніку, але галоўнае, што касцяк людзей, якія ствараюць тэлевізійны прадукт, захаваўся. Радуе, што захоўваецца цяперашнімі прафесіяналамі ўсё тое, над чым працавалі да іх, але разам з тым удасканальваецца і адпавядае сённяшняму дню.

**Вольга МЯДЗВЕДЗЬ, карэспандэнт АТН, вядучая праграм «Навіны рэгіёна», «НЕ:ИТОГИ»:**

— Быць у камандзе АТН — вельмі цікава і заўсёды непрадказальна. Прачынаешся раніцай з адным
і планамі, а потым усё змяняецца ў адно імгненне. Са мной асабіста ўсякае здараецца на праграме «Навіны рэгіёна». Літаральна 31 снежня прыйшла ў студыю са спадзяваннем на лёгкі эфір, а ён аказаўся самым складаным за ўвесь час маёй работы на тэлебачанні. Перад выпускам мы вырашылі памяняць камеры, зрабіць святочны план з ёлкай. Але ж падчас эфіру я неяк разгубілася, не адразу сарыентавалася і не змагла прачытаць слова «пухнатыя», узнікла паўза ў эфіры, хоць я сама рэдагавала тэкст карэспандэнта напярэдадні. І ў тым жа выпуску мая калега не паспела даслаць сюжэт на эфір... Я агучваю падводку, а мне ў навушнік кажуць, што сюжэт то ляціць, то не ляціць. Я ў паніцы, але чую, што трэба прачытаць іншую відэаінфармацыю, а потым зноў падводзіць да навіны па-новай, імправізаваць. Неяк выкруцілася, але калі са студыі выйшла ў мяне яшчэ доўга дрыжалі рукі. Кожная з такіх сітуацый загартоўвае нас. Дзякуючы сваёй рабоце, я магу апынуцца там, дзе можа ніколі б і не пабывала. Дзеля кадра як журналісты, так і аператары часам ідуць на нечаканыя нават для сябе ўчынкі. Год назад я, напрыклад, апынулася ў ліку тых, хто на здымках роліка зімою ў плюс адзін гуляў у валейбол у адным купальніку, а холадна было так, што мы па мячы трапіць не маглі. Здараецца шмат самых розных сітуацый, якія не запланаваныя, але затое ёсць што ўспомніць і будзе што ўнукам распавесці.



**Аляксандр ХАРАВЕЦ, кіраўнік адзела рэпарцёраў:**

— Усё АТН — гэта як сэрца, дзе кожны з аддзелаў працуе на тое, каб яно білася. І наш аддзел таксама з такіх. Я год назад стаў кіраўніком гэтага падраздзялення, і па першым часе такія перамены былі, нібыта ўзнікла новая сям'я, але ніхто не ведае, што іх чакае за паваротам. Для мяне мая каманда таксама сям'я, дзе кожны з'яўляецца асобай са сваім характарам, настроем, што патрабуе індывідуальнага падыходу. Калі ж яго ўдаецца знайсці, то пачынае працаваць вялікі механізм, і класна, што ты ў кожным чалавеку можаш быць упэўнены, як у самім сабе, якое б заданне яму не даў. Да прыходу на пасаду кіраўніка я быў спецыяльным карэспандэнтам у аддзеле рэгіёнаў. Там аб'ездзіў усю Мінскую вобласць і змог пазнаёміцца з работай самых розных сфер дзейнасці. Што дазваляе і да сённяшняга дня трымаць руку на пульсе падзей. Зразумела, у нашай працы хапае ўсяго. Бывае, перад эфірам журналіст забыў флэшку і ты прыдумваеш выйсце з сітуацыі. Ці вечарам у 11 гадзін табе трэба знайсці чалавека, які паедзе рабіць эксклюзіўны сюжэт, бо нельга, каб нехта паспеў расказаць пра навіну раней за нас. Але галоўнае, каб ніякія казусы і форс-мажоры не сарвалі выпуск. Аднак для мяне работа ў АТН — гэта тое, чым я жыву і дзякуючы чаму разумею, дзеля чаго прачынаюся штодня. І вельмі важна, што мая сям'я мяне падтрымлівае. Ведаеце, я, мабыць, часам раздражняю сваіх калег, калі кажу, што мы адна каманда. Безумоўна, нават калі ўявіць, што кожны з нас толькі вінцік, але як усе разам мы працуем зладжана, то заводзім вялізны механізм. І мне хочацца пажадаць усім нам заставацца адзінай камандай, дзе ты ўпэўнены ў кожным, хто стаіць перад ці за табой, ці то аператар, ці кіроўца, з якім едзеш на здымкі. Тады ўсё ў нас будзе!

**Вікторыя СЯНКЕВІЧ, намеснік дырэктара АТН:**

— Для мяне Агенцтва тэлевізійных навін — большая частка майго жыцця, дзе ёсць драйв, ночы без сну, але ўсё гэта робіць мяне шчаслівай. Як і кожны супрацоўнік агенцтва, я ўніверсальны салдат, бо была і вядучай «Панарамы», «Галоўнага эфіру», рабіла фільмы і спецыяльныя праекты, здымала сюжэты, выступала ў ролі прадзюсара, каментатара на прамых эфірах. Аднак тое, чым я і кожны з нас займаецца, — для нас любімая справа. Мы можам недасыпаць, рэдка бачыцца з блізкімі людзьмі, забываць пра песці, але пачуццё, што ты займаешся штодня любімай работай, ні з чым не параўнаць.



АТН рабілі і ствараюць энтузіясты. Для нас галоўнае не прэстыж, узнагароды ці матэрыяльнае ўзнагароджанне, бо мы «хварэем» сваёй справай. Калі казаць пра каманду, з якой зараз працуем, то варта адзначыць, што ўсё наша кіраўніцтва выйшла з нізоў, з рэпарцёраў. І вялікая ўдача працаваць сярод людзей, што разумеюць цябе з паўслова, для якіх галоўнай каштоўнасцю з'яўляецца эфір і якасны кантэнт.




Акрамя выпускаў навін, мы робім шмат іншых праектаў. Лічу, у гэтым наша вялікая перавага на беларускім рынку перад іншымі інфармацыйнымі агенцтвамі. Мне складана выдзеліць нешта з нашых спецыяльных праектаў, вялікіх фільмаў, таму што кожны год мы прыдумваем штосьці новае і ўсё маштабней рэалізоўваем свае ідэі. Калі казаць пра 2020-ы, то не буду прыадкрываць таямніцы, бо гэты год, хоць і юбілейны для нас, але такі ж напружаны, як і мінулыя. Прыйдзе час, і мы пра ўсё раскажам і пакажам!

**Алена ДРАПКО.**

**Фота з асабістага архіва герояў.**

На скрыжаванні думак

# А ВЫ ГАТОВЫ ДА ЗМЕН?

## Пра важныя рэчы — за адукацыйным бранчам

**25 студзеня ў Мінску стартуе серыя прафесійных сустрэч педагогаў у нефармальнай абстаноўцы — адукацыйных бранчаў, куды запрашаюцца неабыякавыя настаўнікі, якім ёсць што сказаць.**



Фота Ганны ЗАНКАВІЧ.

«Рабі, вучыся, дзяліся з іншымі і змяняй» — менавіта так ахарактарызавала сутнасць мерапрыемства адзін з яго арганізатараў, **сузаснавальнік акадэміі крэатыўных тэхналогій IT Princess і прыватнай школы STEAM, выкладчык, бізнес-кансультант і ментар Валянціна ЧЭКАН.** — Гатоўнасць да змен — адна з галоўных умоў поспеху трансфармацыі адукацыйнай сістэмы. Гатоўнасць у гэтым выпадку разумеецца намі з двух пазіцый. Першая — педагог ведае, як змяніць адукацыйны працэс і што для гэтага трэба рабіць. Другая — ён валодае інструментамі: спосабамі, прыёмамі, тэхналогіямі... Гатоўнасць да змен уключае жаданне асвойваць новае і рэалізоўваць яго на практыцы. Гэта, я ўпэўнена, асабісты выбар кожнага педагога.

Праблематыка першай сустрэчы, якая адбудзецца 25 студзеня, — «Адукацыйны працэс у школе: што можна было б зрабіць, калі б можна было рабіць усё?» 8 лютага на абмеркаванне выносіцца тэма «Метадыкі і філасофія адукацыйнага працэсу: ці адчуваем мы розніцу?». 22 лютага ў цэнтры ўвагі будуць настаўніцкая этыка, рызыкі і вырашэнне канфліктных сітуацый. Ацэньванне і матывацыю (ці можна паставіць паміж імі знак роўнасці) педагагічная супольнасць абмяркуе 14 сакавіка.

«Мы выступаем у якасці арганізатараў адукацыйных бранчаў, ініцыятараў дыскусій, але ў нас няма гатовых адказаў на ўсе пастаўленыя пытанні», — падкрэслівае **кіраўнік IT-школы Myfreedom, архітэктар адукацыйных сістэм, адукатар Яўген ЛУФЕРЧЫК.**

— Нельга сядзець на месцы і чакаць, пакуль іншы рэалізуе ідэю, якая нарадзілася ў цябе ў галаве. Якой бы дзівацкай ні была думка — дзяліся ёю і шукай аднадумцаў. Самае галоўнае — гэта зразумець, што ты не адзінокі і абавязкова знойдуцца людзі, гатовыя цябе падтрымаць, — разважае Валянціна Чэкан. — Нашы адукацыйныя бранчы — шанц падрасці ў прафесійным плане праз стасункі з носьбітамі цікавых ідэй. Кожны чалавек унікальны і мае каштоўны багаж з ведаў і вопыту. Вучыся аддаваць бескарысліва — і ты зможаш атрымаць у тысячу разоў больш!

Дзяліся чым-небудзь. Гэта няпраўда, што табе няма чым падзяліцца з калегамі. Зазірні ўнутр сябе і знайдзі тое, што можа быць цікава хоць аднаму чалавеку на планеце. А гэта ўжо значыць, што ты знойдзеш тысячы такіх жа, як сам. Калі пераступіш цераз страх застацца незразумелым, перад табой адкрыюцца новыя гарызонты. А калі твае ідэі становяцца здабыткам дзесяткаў і сотняў іншых, яны набываюць зусім іншую форму, ператвараюцца з фантазій у рэальныя рэчы. Таму, пачуўшы ад незнаёмых людзей адгалоскі сваіх думак, не здзіўляйся, бо ты ўжо пачаў змяняць свет.

Для ўдзелу ў адукацыйных бранчах патрабуецца папярэдняя рэгістрацыя: https://forms.gle/fftn2S6mCqqHFYHU7.

**Надзея НІКАЛАЕВА.**

## Извещение об открытом аукционе по продаже земельных участков в собственность в г. Гродно (ул. Суворова, микрорайон «Заболоть») 11 февраля 2020 года

| № лота | Наименование объекта | Местонахождение объекта | Площадь земельного участка (га) | Кадастровый номер | Ориентировочная стоимость затрат на изготовление документации, руб. | Начальная цена продажи, руб. | Сумма задатка, руб. |
|---|---|---|---|---|---|---|---|
| 1 | Земельный участок * | ул. Суворова, между жилыми домами № 116 и № 118 | 0,0768 | 440100000001011260 | 3397,67 | 40 197,12 | 4100 |
| 2 | Земельный участок У-355* ** | микрорайон «Заболоть-2» | 0,1001 | 440100000002010091 | 3501,10 | 17 167,15 | 3500 |

* – Земельные участки предоставляются в частную собственность для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома. Инженерные коммуникации на участке отсутствуют. Земельный участок имеет ограничения;
** – победитель аукциона возмещает убытки, причиняемые землепользователю в связи с изъятием части земельного участка и удалением расположенных на нем зеленых насаждений в сумме 1200 рублей.
Организатор аукциона: коммунальное унитарное предприятие по оказанию услуг «Гродненский центр недвижимости».
Условия, предусмотренные в решении о формировании земельного участка для проведения аукциона и предоставлении его победителю аукциона либо единственному участнику несостоявшегося аукциона:
внесение платы за земельные участки; возмещение затрат на организацию и проведение аукциона, в том числе расходов, связанных с изготовлением и предоставлением участникам документации, необходимой для его проведения; обращение за государственной регистрацией прав на земельный участок в РУП «Гродненское агентство по государственной регистрации и земельному кадастру» в двухмесячный срок после утверждения протокола о результатах аукциона либо признания аукциона несостоявшимся; получение победителями аукциона в установленном порядке технической документации и разрешения на строительство жилого дома; занятие земельных участков (осуществление строительно-монтажных работ) осуществить не позднее одного года со дня утверждения в установленном порядке проектной документации на строительство одноквартирного жилого дома, возместить затраты в соответствии с постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 01.04.2014 г. № 298 «Об утверждении Положения о порядке возмещения лицом, которому предоставлен земельный участок, затрат на строительство, в том числе проектирование, объектов распределительной инженерной и транспортной инфраструктуры к такому земельному участку» и решением Гродненского горисполкома от 30.05.2019 г. № 371 «О возмещении затрат на строительство объектов распределительной инженерной и транспортной инфраструктуры».
**Аукцион состоится 11 февраля 2020 года в 12.00 по адресу: г. Гродно, пл. Ленина, 2/1 ( актовый зал).**
Для участий в аукционе необходимо: внести задаток в размере, указанном в графе 8, перечисляемый на расчетный счет BY24 AKBB 3012 0000 4181 0400 0000 в филиале № 400 ГОУ ОАО «АСБ Беларусбанк», г. Гродно, БИК AKBBBY21400, УНП 590727594, получатель – КУП по оказанию услуг «Гродненский центр недвижимости». Задаток вносится в белорусских рублях в сумме согласно настоящему извещению;
представить в КУП по оказанию услуг «Гродненский центр недвижимости» следующие документы: заявление на участие в аукционе установленной формы; документ, подтверждающий внесение суммы задатка; подписанное соглашение о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона (в двух экземплярах) установленной формы, включающее обязательство по уплате в соответствии с законодательством штрафных санкций и иные требования. Дополнительно представляются: гражданином – копия документа, содержащего его идентификационные сведения, без нотариального засвидетельствования; представителем гражданина – нотариально удостоверенная доверенность.
При подаче документов на участие в аукционе граждане Республики Беларусь предъявляют паспорт гражданина Республики Беларусь, а представители граждан – документ, удостоверяющий личность.
Прием документов, консультации по вопросам участия в аукционе и ознакомление с имеющейся документацией осуществляются по адресу: г. Гродно, пл. Ленина, 2/1, кабинет 407 с 30 декабря 2019 года по 22 января 2020 года включительно в рабочие дни с 08.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00.
Торги в отношении каждого земельного участка проводятся при условии наличия двух или более участников. Победителем торгов по каждому предмету аукциона признается участник, предложивший наиболее высокую цену.
Победитель торгов либо единственный участник несостоявшегося аукциона, выразивший согласие на приобретение земельного участка, как единственный, подавший заявление на участие в аукционе, в течение 10 рабочих дней со дня утверждения протокола о результатах аукциона либо признания аукциона несостоявшимся обязан;
внести плату за земельный участок; возместить организатору аукциона затраты на организацию и проведение аукциона, в том числе расходы, связанные с изготовлением и предоставлением участникам документации, необходимой для его проведения. Информация о данных затратах, порядке их возмещения доводится до сведения участников аукциона до его начала при заключительной регистрации под роспись; выполнить условия, предусмотренные в решении об изъятии земельного участка для проведения аукциона и предоставлении его в частную собственность победителю аукциона либо единственному участнику несостоявшегося аукциона.
После совершения названных действий, но не позднее 2 рабочих дней, Гродненский горисполком выдает победителю аукциона либо единственному участнику несостоявшегося аукциона выписку из решения об изъятии земельного участка для проведения аукциона и предоставлении его в частную собственность для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома, один экземпляр протокола о результатах аукциона либо признания аукциона несостоявшимся, а также градостроительный паспорт земельного участка (при наличии).
Оплата стоимости предметов аукциона осуществляется по безналичному расчету за белорусские рубли.
При невыполнении требований об обращении за государственной регистрацией прав на земельный участок в двухмесячный срок после утверждения протокола о результатах аукциона либо признании аукциона продажи несостоявшимся решение Гродненского горисполкома о предоставлении земельного участка утрачивает силу.
Осмотр земельного участка на местности производится желающими самостоятельно в удобное для них время.
**Контактные телефоны: + 375 (152) 72 05 37, 72 00 10, официальные сайты организатора торгов: www.grodno.gov.by, gcn.by**

## ЗАО «Белреализация» извещает о проведении электронных торгов по продаже имущества ОАО «Беларусьрезинотехника»

Организатор торгов: **ЗАО «Белреализация»** (УНП 191113330), 220089, г. Минск, ул. Уманская, 54, 4-й этаж паркинга, каб. 27, тел.: (8017) 298-53-53; (8029) 690 54 09, **BELTORGI.BY.**
**Продавец:** ОАО «Беларусьрезинотехника» (УНП 700069297) 213829, Могилевская обл., г. Бобруйск, ул. Минская, д. 102, в лице управляющего в деле о банкротстве Мясоедова Руслана Федоровича.
Электронные торги в процедуре экономической несостоятельности (банкротства) по делу № 15-11/Б/2019 в экономическом суде Могилевской области будут проведены: **11 февраля 2020 г**. **09.00–16.00** на электронной торговой площадке **BELTORGI.BY.**

| № п/п | Предмет торгов | Начальная цена предмета торгов, бел. руб. с НДС 20 % | Минимальная цена предмета торгов, бел. руб. с НДС 20 % |
|---|---|---|---|
| 1 | Капитальное строение с инв. № 710/С-3773, склад каучуков и химического сырья, корпус № 99, общей площадью 5320,3 кв. м, 1976 года постройки | 544 800,00 | 490 320,00 |
| 2 | Капитальное строение с инв. № 710/С-3768, заводоуправление, корпус № 24, общей площадью 1028,4 кв. м, 1961 года постройки | 489 600,00 | 440 640,00 |
| 3 | Автомобиль грузопассажирский специальный УАЗ 39629-016, 2006 г. в., кузов (рама) 39620060215368 | 5400,00 | 4860,00 |
| 4 | Автомобиль грузовой, бортовой ЗИЛ-431410, 1988 г. в., кузов (рама) № 2698587 | 3720,00 | 3348,00 |
| 5 | Лот 5: автомобиль грузовой, бортовой, тентовый ЗИЛ 53-1 АО, 1997 г. в., кузов (рама) XTZ5301A0V0006484 | 2400,00 | 2160,00 |
| 6 | Автомобиль грузовой, бортовой, ЗИЛ 431416, 1987 г. в., кузов (рама) № 2700372 | 3600,00 | 3240,00 |
| 7 | Автомобиль грузовой, бортовой тентовый, ГАЗ 3307, 1992 г. в., кузов (рама) XTH330700N1397358 | 3720,00 | 3348,00 |
| 8 | Автомобиль грузовой, бортовой тентовый, ГАЗ 3307, 1992 г. в., кузов (рама) XTH330700N1507001 | 3720,00 | 3348,00 |
| 9 | Автомобиль грузовой, бортовой тентовый, КАМАЗ 5320, 1991 г. в., кузов (рама) КАБ 1378239 XTC532000M0383936 | 4680,00 | 4212,00 |
| 10 | Автомобиль грузовой, бортовой, МАЗ 5337, 1988 г. в., инв. № 8405, кузов (рама) № XTM53371000000902 | 5040,00 | 4536,00 |
| 11 | Прицеп СЗАП 8357, бортовой тентовый, г. в. не определен, кузов (рама) № б/н | 5040,00 | 4536,00 |
| 12 | Прицеп бортовой МАЗ 8926, 1988 г. в., кузов (рама) № 872575 | 2160,00 | 1944,00 |
| 13 | Полуприцеп МТМ 9330, 2001 г. в., кузов (рама) № Y3D93301110001503 | 8280,00 | 7452,00 |
| 14 | Полуприцеп бортовой МАЗ 93866, 1992 г. в., кузов (рама) № 0001118 | 3240,00 | 2916,00 |
| 15 | Полуприцеп бортовой МАЗ 9380, 1991 г. в., кузов (рама) XTM938000100000665 | 2520,00 | 2268,00 |
| Местонахождение – **Могилевская обл., г. Бобруйск, ул. Минская, д. 102**, подробная информация на **BELTORGI.BY** | | | |

Для участия в торгах необходимо в срок по 10 февраля 2020 г. 17.00: 1) зарегистрироваться и подать заявку по выбранному лоту на участие в торгах на сайте **BELTORGI.BY;** 2) перечислить задаток по выбранному лоту на р/с BY33BPSB30121854590139330000 в ОАО «БПС-Сбербанк», код BPSBBY2X, УНП 191113330, получатель – ЗАО «Белреализация». Шаг торгов – 5 %, задаток – 10 % от начальной цены предмета торгов. Победителем торгов признается участник, предложивший максимальную цену за лот. Победитель торгов обязан возместить сумму фактических затрат, связанных с организацией и проведением торгов, в течение 5 рабочих дней со дня их проведения, а также аукционный сбор. Договор купли-продажи должен быть подписан не позднее пяти рабочих дней со дня завершения электронных торгов

## Извещение о проведении электронных торгов

| Организатор аукциона | ЗАО «Центр промышленной оценки», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703 |
|---|---|
| Продавец | ОАО «КУПАЛИНКА», Минская обл., г. Солигорск, ул. Заслонова, 58 |
| Оператор ЭТП | ООО «ИПМ-Консалт оценка», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703 |
| Предмет электронных торгов: | |
| **Кругловязальная машина Mayer@Cie,** тип 559/FS-2.0 инв. № 4307 (бывший в употреблении).<br>Местонахождение: Минская обл., г. Солигорск, ул. Заслонова, 58.<br>**Начальная цена (с НДС 20 %) – 103 440,00 бел. руб.** | |
| **Задаток 10 %** от начальной цены предмета аукциона в белорусских рублях (**BYN**) перечисляется на счет **BY60BLBB30120191021390001001;** нерезидентами РБ задаток может перечисляться в валютном эквиваленте по курсу Нацбанка РБ на дату платежа на счет: в долларах США (**USD**) – **BY76BLBB30120191021390001004** в евро (**EUR**) – **BY33BLBB3012019-1021390001002;** в российских рублях (**RUB**) – **BY22BLBB30120191021-390001006** в Дирекции «ОАО Белинвестбанк» по г. Минску и Минской области (адрес банка: г. Минск, ул. Коллекторная, 11), БИК BLBBBY2X, получатель платежа – ЗАО «Центр промышленной оценки», УНП 191021390 | |
| Срок подписания договора купли-продажи | **10** (десять) рабочих дней после электронных торгов |
| Условия оплаты предмета электронных торгов | |
| Если между продавцом и покупателем (победитель аукциона либо единственный участник аукциона, согласившийся приобрести предмет аукциона по начальной цене, увеличенной на 5 %) в течение срока, установленного для подписания договора купли-продажи, не достигнута договоренность по срокам и о порядке оплаты предмета аукциона, такая оплата должна быть произведена в течение **30 (тридцати) календарных дней** после заключения договора купли-продажи | |
| Электронные торги проводятся в порядке, установленном регламентом электронной торговой площадки «ИПМ-Торги», размещенным по адресу: **www.ipmtorgi.by** | |
| Победитель аукциона либо единственный участник электронных торгов, согласившийся приобрести предмет аукциона по начальной цене, увеличенной на 5 %, обязан возместить затраты на их проведение и оплатить вознаграждение организатору аукциона в размере **4 %** в течение **3 (трех) рабочих дней** со дня проведения аукциона | |
| Организатор электронных торгов имеет право снять предмет аукциона с электронных торгов в любое время до момента определения победителя электронных торгов без объяснения причин снятия | |
| Дата и время начала и окончания электронных торгов | |
| Начало торгов: **11.02.2020 в 11.00.**<br>Окончание торгов: **11.02.2020 в 12.00.**<br>Торги продлеваются на 10 минут с момента подачи ставки в случае если ставка поступила менее чем за 10 минут до окончания торгов | |
| Дата и время окончания приема заявок | |
| Заявки на участие в электронных торгах принимаются по **10.02.2020 до 17.00** на ЭТП «ИПМ-Торги» по адресу: **www.ipmtorgi.by** | |
| **Контактные данные: +375 (17) 373-21-33; +375 (44) 704-92-06. E-mail: auction@cpo.by** | |

## О реализации имущества ЗАО «Могилевская швейная фирма «Вяснянка

| Организатор торгов | ООО «Могириус» – антикризисный управляющий в деле о банкротстве ЗАО «Вяснянка» УНП 790956888 (212030, г. Могилев, ул. Ленинская, 91) |
|---|---|
| Продавец | ЗАО «Могилевская швейная фирма «Вяснянка»: 212030, г. Могилев, ул. Ленинская, 91, УНП 700008631 |
| Форма, дата, место и время начала проведения торгов | Открытые торги в форме аукциона.<br>Дата: 14 января 2020 года,<br>Место: г. Могилев, ул. Ленинская, 91,<br>время: 10.00 |
| Сведения о предмете торгов, порядок ознакомления с ним | Лот № 1: предприятие как имущественный комплекс (ПИК) ЗАО «Могилевская швейная фирма «Вяснянка». Рег. номер 0001400, свидетельство № 3498 от 19.09.2019. Состав имущества и имущественных прав размещен на сайте www.bankrot.gov.by. Ознакомиться с предметом торгов можно по адресу: г. Могилев, ул. Ленинская, 91 в рабочие дни с 9.00 до 16.00 |
| Начальная цена предмета торгов | Лот № 1: **6 115 000,00 бел. руб.,** без учета НДС, согласно п. п. 2.30.1 ст. 115 Налогового кодекса Республики Беларусь (Особенная часть) |
| Порядок проведения торгов | Имущество считается проданным лицу, которое предложило на торгах самую высокую цену. Шаг торгов – 5 % от стоимости лота. В случае если торги признаны несостоявшимися, предмет торгов продается единственному участнику, подавшему заявление на участие в торгах (либо явившемуся для участия в них) при его согласии по начальной цене, увеличенной на 5 %. Победитель торгов в день проведения торгов подписывает протокол аукциона. Оплатить предмет торгов в порядке и в сроки, установленные договором купли-продажи. Организатор торгов вправе отказаться без объяснения причин от проведения торгов, но не позднее чем за 5 дней до даты их проведения |
| Размер, порядок и сроки внесения задатка, сроки приема заявок на участие в торгах и прилагаемых к ним документов | Сумма задатка для участия в торгах – 10 % от начальной стоимости лота. Сумма задатка в срок до 13.01.2020 (включительно) вносится в бел. руб. на р/с BY28BLBB30120700008631001005 в Дирекции ОАО «Белинвестбанк» по Могилевской области, г. Могилев, ул. Первомайская, 29 АБИК BLBBBY2X, УНП 700008631, получатель платежа – ЗАО «Могилевская швейная фирма «Вяснянка». Назначение платежа – задаток для участия в торгах по продаже ПИК ЗАО «Могилевская швейная фирма «Вяснянка».<br>Заявка на участие в торгах и прилагаемые к ней документы принимаются в срок до 16.30 13.01.2020 по адресу: 212030, г. Могилев, ул. Ленинская, 91.<br>К заявке прилагаются: платежный документ с отметкой банка о внесении задатка; копии документов, подтверждающих юр. полномочия участников торгов: для юр. лиц – копия свидетельства о госрегистрации; доверенность, выданная представителю юр. лица (кроме случаев, когда юр. лицо представляет его руководитель), для ИП – копия свидетельства о госрегистрации ИП; для физ. лица – копия паспорта. Заявки, поступившие после установленного срока, рассмотрению не подлежат. Сроком поступления заявки является дата его регистрации в журнале регистрации заявок на участие в торгах.<br>Более подробную информацию о порядке проведения торгов можно узнать в рабочие дни с 09.00 до 16.00 по тел.: 8029 683-74-83, 8029 388-80-18 |
| Возмещение затрат | Возмещение затрат на организацию и проведение торгов производится победителем аукциона по фактическим затратам (расходы на проведение аукциона; расходы на проведение оценки имущества, выставленного на торги; расходы, связанные с регистрацией договора купли-продажи). Победитель торгов обязан перечислить на расчетный счет продавца сумму фактических затрат в течение 5 дней со дня проведения торгов |
| Порядок заключения договора и уплаты цены предмета торгов | Срок подписания договора купли-продажи – 15 рабочих дней после торгов. Победитель аукциона либо единственный участник аукциона, согласившийся приобрести предмет аукциона по начальной цене, увеличенной на 5 %, обязан оплатить предмет аукциона в соответствии с договором купли-продажи, но не позднее 30 дней со дня проведения торгов, если иной срок не установлен собранием (комитетом) кредиторов |

УНП 700008631

## ЗАО «Центр промышленной оценки» сообщает о проведении 12.02.2020 в 12.00 по адресу: г. Минск, ул. Тимирязева, 29, аукциона по продаже имущества ОАО «Минский завод отопительного оборудования»

| Количество лотов | Наименование имущества | Начальная цена продажи с НДС, бел. руб. | Задаток | Шаг аукциона |
|---|---|---|---|---|
| 470 | Извещение о проведении аукциона и подробные сведения о реализуемых лотах (недвижимое имущество, оборудование) размещены на сайте **www.bankrot.gov.by** (в разделе «должники», ОАО «Минский завод отопительного оборудования», «реализация») и официальном сайте организатора аукциона **(www.cpo.by)** | 9 074 204,40 бел. руб. (всех лотов). Начальная цена каждого лота указана на сайтах **www.bankrot.gov.by** и **www.cpo.by** | 10 % от начальной цены по каждому лоту | Фиксированная сумма, составляющая 5 % от начальной цены по каждому лоту (указана на сайтах **www.bankrot.gov.by** и **www.cpo.by)** |

**Дата, время, место окончания приема заявлений на участие в торгах: 07.02.2020** в 17.00, г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703, ЗАО «Центр промышленной оценки».
**Месторасположение имущества:** Минская обл., Воложинский р-н, аг. Раков, ул. Радошковичская, 51 (недвижимое имущество); г. Минск, ул. Тимирязева, 29 (оборудование).
**Срок подписания договора купли-продажи**: в течение 5 рабочих дней после проведения аукциона.
**Срок оплаты за предмет аукциона:** не позднее 10 дней со дня проведения торгов.
**Срок возмещения затрат на организацию и проведения аукциона и оплаты вознаграждения организатору аукциона:** в течение 5 (пяти) дней со дня проведения аукциона.
Порядок оформления участия в торгах, критерии выявления победителя торгов и порядок оформления результатов торгов определяется ст. 127, 128, 129 Закона Республики Беларусь от 13.07.2012 № 415-З «Об экономической несостоятельности (банкротстве)».
**Список реализуемого имущества и подробная информация о порядке проведения аукциона размещены на сайте www.bankrot.gov.by и www.cpo.by.**
Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время до объявления его проданным без объяснения причин снятия.
Ознакомление с предметами аукциона осуществляется в рабочие дни с 09.00 до 16.00, +375 17 204 40 38 (Шавель Татьяна Александровна)

УНП 100008064

Гісторыя газеты — гісторыя краіны

# ВЫТРЫМАЦЬ І АДНАВІЦЦА:

## Першыя 25 гадоў Беларускай рэспублікі

**Калі зазірнуць у снежаньскія і студзеньскія нумары «Звязды» мінулага стагоддзя, можна даведацца, чым жыла маладая Беларусь, як пераадольвала няпростыя часы і як аднаўлялася пасля складаных выпрабаванняў. БССР была створана 1 студзеня 1919-га, і з гэтага часу кожны год у зімовых нумарах газеты падводзяцца вынікі, што зроблена, і ставяцца планы на наступны год.**

### МІНУС СТО

Перыяд узрушэнняў і змен, сутыкненне розных ідэй і планаў наконт беларускіх тэрыторый, пастаянная змена ўлад. Чырвоныя, белыя, савецка-польская вайна, грамадзянская, выгнанне паноў, іх вяртанне... Каму верыць? Што прымаць? Такі быў першы год Беларускай рэспублікі. Савецкая ўлада пратрымалася ў Мінску ўсяго восем месяцаў, а пасля беларускія землі сталі арэнай ваенных дзеянняў «Ці стала зразумелай сялянскім і рабочым масам на працягу гэтага года пралетарская рэвалюцыя і прынцыпы савецкай улады?» Такое пытанне было ўзнята ў «Звяздзе» ў студзені 1920 года: «Калі год таму ідэя Савецкай Беларусі была ідэяй чужой для большасці сялян і рабочых, калі перад сыходам немцаў іх цікавіла толькі змена ўлады, не разбіраючыся ў тым, што гэтая змена можа прынесці, як будзе дзейнічаць тая ці іншая ўлада, якая прыйдзе на змену той, што сыходзіць, то зараз сяляне і рабочыя сталі свядома за савецкую ўладу... Год таму нам лёгка далася савецкая заваёва Беларусі. Без кроплі крыві былі заняты велізэзныя абшары. Зараз становішча змянілася. Цяпер толькі крывёй мы можам купіць савецкі лад у Беларусі. Перад намі стаіць магутная армія легіянераў, гатовая рынуцца далей на Магілёў, Віцебск і Смаленск, якая ўтрымліваецца толькі моцнымі штыкамі Чырвонай Арміі».

Ідзе савецка-польская вайна, насельніцтва ў прыфрантавой зоне бяднее. У канцы 1919-га — 1920-м годзе «Звязда» выходзіць у Смаленску, перыядычна яна друкуе лісты, якія прыходзяць з акупаваных земляў. З занятага палякамі Мінска скардзяцца, што няма ніякай работы, нават на самых буйных гарбарнях працуе ўсяго па 20—30 чалавек, многія майстэрні наогул зачынены. Беспрацоўныя даведзены да галечы. Моцна растуць цэны на хлеб і іншыя прадукты. Нават дровы купіць праблема і многія гараджане мерзнуць. Вядзецца спекуляцыя грашыма.

Мінскія настаўнікі пяць месяцаў не атрымлівалі заробку. «Яны ўжо прадалі ўсю вопратку. Панарабілі даўгоў. Даўно ўжо не ўжывалі тлушчаў, ды і бульбы ўжо не ў стане дабіцца. Некаторыя ўжо не выносяць такіх пакут і накладаюць на сябе рукі ці кідаюць настаўніцкую працу, шукаюць чорнай работы. Не лепшы стан саміх школ: няма дроў для паліва».

Населеныя пункты ў прыфрантавой паласе некалькі разоў пераходзяць з рук у рукі, і кожная змена ўлад суправаджаецца рабаваннем і разбоем. У «Звязду» ідуць скаргі на пагромы ў акупаваных гарадах: *«...дэлегацыя яўрэйскай абшчыны звярнулася да начальніка штаба капітана Вінчэўскага са скаргай наконт пагромаў, што мелі месца ў Мінску ў апошнія дні. Капітан Вінчэўскі сказаў, што, сапраўды, у горадзе маюцца «некаторыя недысцыплінаваныя часці»; ён паабяцаў іх вывесці з горада». «Дазваляецца хадзіць па вуліцах Бабруйска толькі да 6 вечара, але і днём вуліцы пустыя. Жыхары пазбягаюць лішні раз выходзіць са свайго дома, баючыся здзекаў з боку п'яных легіянераў, якія натоўпамі шнараць па горадзе. Мужчыны зусім не паказваюцца на вуліцы, бо іх збіваюць і зводзяць на розныя работы... У першыя дні ў Бабруйску ішло пагалоўнае рабаванне, бо горад быў аддадзены на тры дні ў распараджэнне салдат... Часта ў дом уваходзяць банды легіянераў, забіраюць электрычныя лямпачкі, мэблю, вопратку ды іншыя больш каштоўныя рэчы. Пры найменшым супрацьдзеянні бязлітасна збіваюць...*

*Але калі ў горадзе творацца жахі, то ў вёсках сапраўдны кашмар. У занятых палякамі валасцях амаль няма незгвалтаваных маладых дзяўчат і нязбітых хлопцаў (выратаваліся ад гвалту толькі тыя, хто збег у лясы падчас набліжэння войска). Нідзе ў сялян няма ні коней, ні кароў. Ва ўсіх забралі хлеб і бульбу... Па дарозе ў горад у сялян забіраюць і коней, і паклажу. Таму сяляне спынілі ўсялякі падвоз у Бабруйск, ад чаго ў горадзе страшэнная дарагоўля».*

Паны, якія вярнуліся на занятыя польскімі войскамі землі, патрабуюць ад бліжэйшых вёсак пакрыць страты, якія яны мелі за час савецкай улады і вайной. «У выпадку адмовы селяніна ўнесці патрабуемую колькасць сена ці хлеба памешчык пасылае да яго жандараў, якія па-зверску збіваюць сялян, некаторыя сяляне так былі пабітыя, што пазбавіліся працаздольнасці. Такі выпадак, напрыклад, быў у вёсцы Сугвазды Валожынскай воласці Ашмянскага павета Віленскай губ. Падасланыя памешчыкам жандары пры збіванні аднаго тамтэйшага селяніна паламалі яму ногі».

Часам сяляне самі становяцца на абарону сваіх земляў, нападаюць на легіянераў, утвараюць партызанскія атрады: «У адарваных і далёкіх кутках Беларусі па рацэ Пціч (мяжа Бабруйскага і Мазырскага паветаў) упершыню ў такой вострай форме разгарэлася Грамадзянская вайна... Павялася самімі сялянамі агітацыя. Моладзь стала бесстрашнай» — пісала «Звязда» 19 кастрычніка 1919 года. Супраць вёсак, што «правініліся», напраўляюцца тры конныя эскадроны з кулямётамі і аўтаматычнымі вінтоўкамі. «На шчасце асуджаных вёсак (Рудо-белка, Рудня, Шкава, Вуглы, Качай-Балота), у гэтую ноч падаспелі чырвонаармейцы, якіх гэты глухі куток бачыў упершыню»...

### ЗАЗІРНЁМ У 20-Я?

Здавалася, аднавіцца пасля такіх узрушэнняў нашы землі змогуць не хутка. 6 снежня 1921 года пасля паездкі па беларускіх вёсках т. Адамовіч пісаў у «Звяздзе»: «Імперыялістычная і грамадзянская вайна моцна адбіліся на вёсцы. І тая паласа, якая зараз з'яўляецца памежнай і якая перанесла ўвесь цяжар баявых аперацый, рэвізій і мабілізацый, мае вялікую патрэбу ў скаціне... У выніку вайнаў і пажараў бедната мае патрэбу ў адбудове сваіх гаспадарак... І толькі зараз, з наступленнем мірнага часу, з вяртаннем дамоў звольненых у запас чырвонаармейцаў, з умацаваннем упэўненасці ў тым, што можна заняцца без перашкод мірнай працай, — зараз, калі селянін хоча будавацца, ён сустракае на сваім шляху шмат перашкод... Няважная справа і са школамі. У іх будынках размяшчаліся вайсковыя часці, і ўсе яны разрабаваныя». Газета б'е трывогу, што катастрафічна не хапае сродкаў на ўтрыманне школ, колькасць іх скарачаецца, жахлівае становішча з дзіцячымі дамамі. Адзін з іх знаходзіцца ў Самахвалавічах. «Памяшканне дома не ацяпляецца, паўсюль бруд, пасцелі складаюцца з цюфяка і коўдры, па якіх разгульваюць паразіты. На адным ложку спяць па 2-3 дзіцяці. Дзеці амаль усе босыя. Басанож ходзяць у школу, у многіх няма нацельнай бялізны... Харчаванне дрэннае. Вучэбных дапаможнікаў, сшыткаў, алоўкаў няма...» У снежні 1922 года ў Мінску праводзіцца дзесяцідзённік дапамогі дзецям. Быў арганізаваны так званы «кубкавы збор» — па горадзе было пушчана 92 кубкі, а таксама ладзіліся спектакль, латарэя і размяркоўваліся налепкі на вокны, прадпрыемствы дапамагалі прадуктамі і грашыма.

У снежні 1922-га — студзені 1923-га года газета паведамляе пра павелічэнне пасяўных плошчаў, нарастанне і пад'ём дробнай прамысловасці, аднаўленне і рамонт школ, бальніц, камунальных дамоў, «...па звестках Статбюро, колькасць разбураных дамоў у Мінску лічыцца тысячамі. У 1923 годзе чакае складаная работа па будаўніцтве і рамонтах, а таксама ў галіне гарадскога добраўпарадкавання, па аднаўленні маставых, мастоў, масткоў... Распрацоўваецца план аднаўлення цэлага шэрагу разбураных, а таксама недабудаваных дамоў. Адначасова абмяркоўваецца пытанне аб уввядзенні ў берагі рэчышча Нямігі, якое штогод выходзіць з берагоў і запаўняе брудам усё наваколле...»

А першае дзесяцігоддзе БССР ужо сустракала буйнымі будоўлямі. Так 31 снежня 1929 года «Звязда» паведамляла, што ў наступным годзе ў рэспубліцы будзе будавацца 55 новых фабрык і заводаў, сярод якіх адна з найбуйнейшых фабрык Саюза — сельмаш у Гомелі. *«Там, дзе былі пусткі і балоты... растуць новыя прадпрыемствы, новыя гіганты вытворчасці. Калі паглядзець зараз на гаспадарчую карту Беларусі, дык убачым лес заводзкіх і фабрычных комінаў, буйныя прамысловыя камбінаты, раскінутыя ў плянавым парадку вялікія электрастанцыі, якія павінны адзець Савецкую Беларусь у густую сетку электрычных правадоў, забяспечыць старыя і новыя прадпрыемствы электрычнай энэргіяй, даць магчымасць саўгасам і калгасам электрыфікаваць свае гаспадаркі. Даць магчымасць нават адсталаму бедняку-селяніну, выпадкова непапаўшаму ў калгас, павесіць у сваёй дымнай хаце лямпачку Ільіча.*

*Савецкая Беларусь набывае такія галіны прамысловасці, да якіх пры царскай уладзе яна б ня прыйшла мо і за сотні год. Мэталяпрацоўчая прамысловасьць, побач з развіцьцём існуючых вытворчасьцяў, узяла напрамак на арганізацыю буйнога машынабудаўніцтва і шырокага развіцьця вырабу сельскагаспадарчых машын і прылад. Швэйная прамысловасьць, якая ў даваенны час у межах БССР знаходзілася на вельмі нізкім тэхнічным узроўні, зараз набывае буйныя індустрыяльныя формы. У гарбарнай прамысловасьці, калі ў даваенны час прыходзілася на кожнае прадпрыемства не больш 20-ці чалавек, дык у сучасны момант БССР мае буйныя заводы, на якіх у сярэднім лічыцца 500—600 чалавек. Панчошна-трыкатажная прамысловасьць, якая ў даваенны час была выключна прадстаўлена саматужнікамі, зараз абсталявана па апошнім слове тэхнікі».*


Российская Коммунистическая Партия (большевиков).
ЗВЕЗДА
Пролетарии всех стран, соединяйтесь!
Орган Центрального Комитета Коммунистической Партии Литвы и Белоруссии.
№ 1 (524). Смоленск, 14 Января 1920 г. Цена № 1 р. 50 к.
Годовщина возникновения Советской власти в Литве и Белоруссии.

У гарадах выраслі рабочыя пасёлкі і камунальныя дамы, павялічыліся заробкі. Беларусь займае першае месца сярод саюзных рэспублік у справе ўвядзення ўсеагульнага навучання. У гэты час пачатковай школай ахоплена 75 працэнтаў дзяцей малодшага ўзросту. Уводзяцца прапановы зрабіць Мінск экскурсійным горадам, куды будуць вазіць замежных дэлегацый, каб паказваць сучасныя формы забудовы і гаспадарання. Плануецца будаваць рабочыя дамы на новы лад, улічыўшы недахопы: *«Дзе ў нашых новых дамох агульныя кухні, агульныя сталовыя, дзіцячыя пакоі, пральні з сушылкамі, чырвоныя куткі-чытальні, залі для спорту. Іх няма. Але мала таго, мы часта-густа будуем дамы бяз самых элемэнтарных санітарна-гігіенічных выгод — бяз ванны і душу. Без цэнтральнага ацяплення і вэнтэляцыі. Гэта дамы-мяшкі, дамы-клеткі, без паветра і бяз сонца, без прасторных задніх двароў з зялёнымі насаджэньнямі, бяз дзіцячых пляцовак...*

*«Новы Менск» пачынае вырастаць на акраіне, па Барысаўскім тракце — у раёне, які мяжуецца з хваёвымі лясамі і зялёнымі палямі, іменна там будуюцца, або пачынаюць будавацца акадэмія навук, новы ВТНУ, клінічны гарадок, інстытут санітарыі і гігіены, інстытут прамысловасьці, палітэхнікум, розныя ўстановы НДІ і г. д. Там жа будзе пабудавана кольца трамваю. У гэтым раёне мы скора ўбачым спартыўны стадыён (ужо будуецца), універмаг МЦРК, кіно-тэатр і многае іншае».*

### ТОСТЫ 1940-ГА

«Падымем самы шчыры тост за хараство Радзімы, за Новы год, за новы рост, за наш народ любімы!» Пад такой шапкай друкуюцца святочныя палосы навагодняга нумара «Звязды» за 1940 год. Пасля ўз'яднання тэрыторыі Беларусі складае 234 тысячы квадратных кіламетраў, насельніцтва павялічылася з 6 мільёнаў да 11. Сярод дасягненняў папярэдняга года — стварэнне беларускай савецкай оперы і беларускага балета, «вырасла прадукцыйнасць працы, краіна дабілася значнага ўздыму працоўнай дысцыпліны, зменшылася колькасць прагулаў і спазненняў, стаханаўскі рух падняўся на новую ступень. Перадавыя рабочыя пераходзяць на мнагастаночнае абслугоўванне, усё шырэй практыкуецца сумяшчэнне прафесій. У планах на бліжэйшы час — аднаўленне і перабудова фабрык і заводаў заходніх абласцей БССР, ліквідацыя прымітыўнай поўсаматужнай тэхнікі. Месцы дробных прадпрыемстваў зоймуць буйныя механізаваныя прадпрыемствы...»

Але ўсе гэтыя здабыткі забярэ вайна...

### З РУІН І ПАПЯЛІШЧАЎ

Новы 1945 год прышоў «у грукаце гармат, у гарачым полымі ўсенароднай творчай працы, у арэоле бліскучых перамог, уззянні новай славы....

Пераможныя сцягі совецкіх палкоў развяваюцца каля сцен Будапешта і Варшавы, у гарах Чэхаславакіі і Югаславіі. Воіны арміі-вызваліцельніцы, завяршыўшы выгнанне нямецка-фашысцкіх захопнікаў з межаў совецкай зямлі, дапамагаюць зараз народам Еўропы скінуць ярмо гітлераўскай няволі». «За 6 месяцаў пасля вызвалення Беларусі аднавіліся сотні фабрык і заводаў. Даў прадукцыю Гомельскі завод сельскагаспадарчага машынабудаўніцтва, Мінская абутковая фабрыка, засвоіў выпуск удасканаленых прыёмнікаў і рэпрадуктараў Мінскі завод імя Молатава, працуе Мінская абутковая фабрыка і многія другія прадпрыемствы. Разгарнулася ўсебеларускае социялістычнае спаборніцтва, рабочыя змагаюцца за перавыкананне плана, павышэнне прадукцыйнасці працы і засваенне выпуску новых відаў прадукцыі. У гарадах і сёлах адноўлена 440 больніц, 831 амбулаторыя, сотні тысяч фельчарска-акушэрскіх пунктаў...»

У рэспубліцы працуюць ужо больш за 10 тысяч школ. Пачаліся заняткі ў БДУ, медыцынскім, педагагічным універсітэтах і іншых вышэйшых навучальных установах. П'есай «Жыццё вучыць» адкрыў сезон Беларускі дзяржаўны драматычны тэатр імя Янкі Купалы. Адкрыты Беларускі дзяржаўны тэатр оперы і балета, філармонія, дзяржаўны драматычны тэатр у Віцебску.

«Калі да вайны ў горадзе налічвалася звыш 15000 дамоў, то пасля нямецкай акупацыі асталося каля 2500 пераважна драўляных аднапавярховых дамоў, і то напалавіну разбураных... Па прыкладу мінчан працоўныя Віцебска актыўна ўключыліся ў аднаўленне свайго горада. Заraз на аднаўленні працуе 636 брыгад». Падшыўкі расказваюць пра тое, як адбудоўваюцца розныя беларускія гарады і вёскі, сведчаць аб працоўных подзвігах...

**Алена ДЗЯДЗЮЛЯ.**

# ЭТНАКАЗКА НЕТРАНЗІТНАЙ ВЁСКІ

## КАЛІ ЧАС БЯРЭ СВАЁ

Музей у Гудзевічах можна назваць міні-комплексам. Ён складаецца з асноўнага будынка, дзе раней была школа, і старой хаткі — яе перавезлі з суседняй вёскі. Справа пачыналася са школьнага музея, які 50 гадоў таму стварыў мясцовы настаўнік беларускай мовы і літаратуры Алесь Белакоз. Новы комплекс быў дабудаваны пазней. Тады ж на тэрыторыі музея з'явілася і драўляная хатка, а з 1990 года ён набыў статус дзяржаўнага і пастаянна папаўняўся.

Тут шмат унікальных экспанатаў. Напрыклад, выданне Францішка Багушэвіча 1896 года «Дудка беларуская» і яго арыгінальны здымак XIX стагоддзя. Захоўваецца тут аўтаручка Уладзіміра Караткевіча. Кажуць, што менавіта ёй пісаўся раман «Каласы пад сярпом тваім». Можна ўбачыць буквар 1918 года пад рэдакцыяй Алесі Смоліч, беларускамоўны глобус з віленскай гімназіі, сапраўдны маніфест ад адмене прыгоннага права... У асобным пакоі — рэчы, якімі славіліся беларускія майстрыхі. Ёсць залы народнай медыцыны, льну і нават каштоўных выкапняў.



Памятаю, што ўразіў вялікі драўляны човен, які стаяў у калідоры музея. Нехта яшчэ казаў, што ён вельмі старажытны, амаль што з паганскіх часоў. Можа і так, але не толькі экспанаты здзівілі, а і сам стан музея. Па ўсім было відаць, што памяшканні патрабуюць рамонту: столь працякала, вапна абсыпалася, фарба на падлозе сцёрлася. Пакідала я музей з супярэчлівым пачуццём. З аднаго боку — багатая скарбніца унікальных здабыткаў беларускай гісторыі і мясцовага краю, з другога — запусцэнне будынка.



## АКЦЭНТ НА ЭТНІЧНЫМ КАЛАРЫЦЕ

Нядаўні прыезд у музей прыемна ўразіў. Многае аднавілася. Як расказала **дырэктар музея Вікторыя ПАЛОЙКА,** тут праведзены вельмі якасны рамонт, з'явіліся зона гардэроба, санвузлы, сувенірная крама. Залы набылі дызайнерскае афармленне, распрацаваны анімацыйныя праграмы, створаны праграмы для інфармавання музеяў Беларусі і Польшчы. Закуплены новыя экспанаты, у тым ліку стылізаваныя жаночыя касцюмы, якія насілі даўней сяляні. На ўсё разам было выдаткавана 200 тысяч еўра: менавіта столькі сродкаў атрымаў музей у рамках праекта міжнароднай тэхнічнай дапамогі Польшча — Беларусь — Украіна. Мэта якога — павялічыць прываблівасць рэгіёна памежжа праз этнічную культуру, як мага паўней выкарыстаць мясцовыя асаблівасці. А па тыя не трэба далёка хадзіць.

Унікальная тутэйшая асаблівасць — падвойнае ткацтва. Дырэктар музея звяртае ўвагу на калекцыю падвойных дываноў — гэта самая вялікая экспазіцыя такога кшталту экспанатаў. Па яе словах, старажытны дыван 1898 года — амаль што адзіны ў краіне. Сама тэхналогія такога ткацтва нават стала нацыянальным здабыткам і ўнесена ў спіс нематэрыяльнай гісторыка-культурнай спадчыны. У Гудзевічах гэтае майстэрства можна ўбачыць не толькі ў музеі, але і звычайным жыцці. Менавіта жыхарка вёскі Вера Белакоз (жонка стваральніка музея) захавала гэта майстэрства.

Народная майстрыха і цяпер, хоць і мае даволі сталы ўзрост, часта наведвае музей, праводзіць майстар-класы. Пераймаць вопыт захавальніцы ўнікальнага рамства прыязджаюць умельцы з усёй Беларусі.

## ДЗЕ САЛАМЯНЫ ДАХ?

І усё ж захоўваць аўтэнтычны фармат не ўдаецца. У вочы кінуўся даволі рэзкі дысананс мінулага і сучаснага. Калі раней драўляная хатка была накрыта саломай, дык цяпер на ёй нехарактэрны для такога будынка шыфер. Ад гэтага вобраз этнаказкі неяк губляецца. У чым тут рэч?

Дырэктар музея расказала, што сёлета дах стаў асыпацца, з'явіліся дзіркі, таму салому давялося зняць. Але ў будучым шыфер зноў накрыюць саломай.

— Калі музей быў пабудаваны, яшчэ былі майстры, якія ўмелі вязаць паркі — спецыяльныя снапы, бо гэта таксама цэлая навука. Прычым салома павінна быць вырашчана толькі на арганіцы. Мінеральныя ўгнаенні робяць яе ломкай, і калі вяжацца парка, салома ломіцца і доўга не ляжыць, — тлумачыць Вікторыя Палойка.

Калі хатку ў 80-х гадах мінулага стагоддзя перанеслі з суседняй вёскі, яе накрылі саломай. Але потым знізу паклалі шыфер, бо стала працякаць. Пры такой тэхналогіі яе трэба часта мяняць, бо яна не «дыхае», парыцца. Саламяны дах усё ж будзе, запэўніла ў музеі, магчыма, налета. Але гэта няпросты працэс, які патрабуе даволі карпатлівай працы.

Пакуль этнаказцы больш адпавядае ўнутраны антураж хаткі. Тут сустракаецца самая сапраўдная аўтэнтыка — і драўляныя чаравікі, і розны рыштунак для печы, дзе раней гатавалася ежа. Збаны, саламяныя скрыні для захоўвання збожжа, мэбля — усім гэтым карысталася не адно пакаленне.

## ЗАХАВАЦЬ ЗДАБЫТКІ

Гудзевіцкі дзяржаўны літаратурна-краязнаўчы музей прапануе не толькі «застылую» гісторыю. Тут праводзяць розныя народныя святы і абрады, рыхтуюць анімацыйныя праграмы. Напрыклад, на Масленіцу частуюць блінамі, ёсць праграмы «У гасцях у Сымоніхі і Лявоніхі», на Калядны таксама ладзяць забавы. Але ці хапае намаганняў, каб цікавы этнаграфічны куток не абміналі турысты?

Як аказалася, вялікі мінус — геаграфічнае становішча вёскі. У гэтым сэнсе славутаму музею не пашанцавала. Гудзевічы знаходзяцца ўдалечыні ад ажыўленых магістраляў, і, каб трапіць сюды, трэба значна збочыць з іх. Праўда, падчас рэалізацыі праекта тут быў сапраўдны турыстычны бум, да таго ж і мясцовая адукацыя спрыяла развіццю ўнутраных экскурсій. Цяпер назіраецца экскурсійны спад, хоць у музеі з дапамогай мясцовых улад мяркуюць не зніжаць узнятую планку.

— Мы стараемся наладзіць стасункі з турыстычнымі фірмамі, але гэта складана, бо вёска, можна сказаць, нетранзітная. Ад нас да трасы Гродна — Ваўкавыск 12 кіламетраў, калі ехаць на Бераставіцу — таксама не па дарозе. Таму мы так арганізуем турыстычны маршрут, каб ахапіць і гэтыя населеныя пункты, — расказвае **старшыня Гудзевіцкага сельскага Савета Кацярына БАСІНСКАЯ.**

Праўда, маршрут не падыходзіць для бязвізавых турыстаў: калі Ваўкавыскі і Бераставіцкі раёны нядаўна ўвайшлі ў бязвізавую зону, дык Мастоўскі аказаўся па-за яе межамі. Такім чынам, у Гудзевічах больш разлічваюць на ўнутраны турызм. Ва ўсякім выпадку, тут абяцаюць добра сустрэць кожнага наведвальніка, а ў кавярні можна арганізаваць абед для турыстаў. Многія, хто прыязджае з іншых рэгіёнаў краіны, гэтым карыстаюцца. Летась тут пабывала 8,5 тысячы чалавек, у асноўным навучэнцы з розных гарадоў.

## ПЛЮС «ЗЯЛЁНЫ» ТУРЫЗМ

Гудзевічы з іх музеем уваходзяць у некалькі турыстычных маршрутаў Мастоўскага раёна. Па словах **дырэктара турыстычнай фірмы Ларысы ВАЎЧОК,** музей з задавальненнем наведваюць замежнікі, схільныя да настальгіі, і гэты кірунак мае добрыя перспектывы:

— Цяпер запатрабаваны настальгічны яўрэйскі турызм. Сюды прыязджаюць людзі, якія ганарацца сваімі каранямі. Напрыклад, у Лунне ёсць цікавы музей з экспазіцыяй польскага мастака Эдварда Ромера, які апошнія гады жыў тут, а яго карціны захоўваюцца па ўсёй Еўропе. Таксама засталося нямала яўрэйскіх домікаў.

– индивидуальный предприниматель – копию свидетельства о государственной регистрации;

– юридическое лицо (резидент Республики Беларусь) – копию документа, подтверждающего государственную регистрацию; нерезидент – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть произведена не ранее чем за 6 месяцев до даты подачи заявления на участие в аукционе) или иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения.

Представитель физического лица, индивидуального предпринимателя, юридического лица предъявляет доверенность (документ, подтверждающий полномочия должностного лица) и документ, удостоверяющий личность данного представителя.

Копии документов предоставляются без нотариального засвидетельствования.

**Победителем аукциона признается участник**, предложивший наивысшую цену за предмет аукциона.

**Победитель аукциона** (единственный участник аукциона) в течение 3 рабочих дней со дня проведения аукциона **обязан**:

1) в установленном порядке перечислить на расчетный счет арендодателя сумму, за которую продан предмет аукциона, за вычетом внесенной им суммы задатка;

2) возместить организатору аукциона затраты на его организацию и проведение, в том числе расходы, связанные с изготовлением и представлением участникам документации, необходимой для его проведения. Информация о затратах на организацию и проведение аукциона, порядке и сроках их возмещения доводится до сведения участников перед началом аукциона под роспись;

3) заключить договор аренды по результатам аукциона в течение 10 рабочих дней со дня проведения аукциона и подписания протокола аукциона.

В случае отказа или уклонения Участника аукциона, ставшего победителем аукциона (единственным участником аукциона), от выполнения следующих обязанностей – подписания протокола о результатах аукциона; оплаты суммы, по которой продано право заключения договора аренды; возмещения затрат на организацию и проведение аукциона; заключения договора аренды:

участник аукциона, ставший победителем аукциона (единственным участником аукциона), **уплачивает штраф** в размере 50 базовых величин.

Если при проведении аукциона участник аукциона вместе с другим(и) участником(ами) аукциона согласится с объявленной аукционистом ценой, но ни один из них не согласится со следующей объявленной аукционистом ценой и после предложения аукциониста этим участникам аукциона объявить свою цену, которая должна быть выше последней цены, с которой согласились участники аукциона, ни один из этих участников не предложит свою цену, в результате чего аукцион будет признан нерезультативным, участник аукциона **уплачивает штраф** в размере 50 базовых величин.

Порядок оформления участия в аукционе, а также порядок проведения аукциона определены Положением о порядке проведения аукционов по продаже права заключения договоров аренды капитальных строений (зданий, сооружений), изолированных помещений, машино-мест, их частей, находящихся в государственной собственности, утвержденным постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 08.08.2009 г. № 1049.

**Телефон для справок: (8 0162) 20-28-88, тел./факс 22-15-42**

## Извещение об открытом аукционе по продаже права заключения договора аренды земельного участка для строительства объекта (ул. Молодая) в г. Гродно 11 февраля 2020 года

| № лота | Наименование объекта | Местонахождение объекта | Площадь земельного участка (га) | Кадастровый номер | Начальная цена, руб. | Сумма задатка, руб. | Ориентировочная сумма расходов по подготовке земельно-кадастровой документации, руб. | Условие продажи и целевое назначение земельного участка |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| 1* | Право аренды земельного участка сроком на 50 лет | ул. Молодая, микрорайон усадебной застройки «Погораны-Кошевники» | 13,0204 | 440100000003006601 | 627 609,32 | 62 760,93 | 16 767,43 | Строительство индустриальным способом группы одноквартирных, блокированных жилых домов |

– земельный участок имеет ограничения.
Победитель аукциона обязан:
в установленном порядке получить разрешение на проведение проектно-изыскательских работ и разработать строительный проект на строительство объекта;
приступить к занятию земельного участка в соответствии с целями и условиями его предоставления не позднее 6 месяцев со дня утверждения проектной документации юридическому лицу, индивидуальному предпринимателю, 1 года – гражданину;
осуществить строительство объекта в сроки, определенные проектно-сметной документацией.
В случае нарушения сроков проектирования и строительства в договоре аренды будут предусмотрены штрафные санкции.
Организатор аукциона: коммунальное унитарное предприятие по оказанию услуг «Гродненский центр недвижимости».
При оформлении заявления лицо, желающее принять участие в аукционе, представляет:
1. Копии платежных поручений о внесении **задатка** за подачу заявления на расчетный счет BY24 AKBB 3012 0000 4181 0400 0000 в филиале № 400 ГОУ ОАО «АСБ Беларусбанк», г. Гродно, БИК AKBBBY21400, УНП 590727594, получатель – коммунальное унитарное предприятие по оказанию услуг «Гродненский центр недвижимости», с отметкой банка-отправителя об их исполнении. **Юридическое лицо:** доверенность, выданную представителю юридического лица (кроме случаев, когда юридическое лицо представляет его руководитель), одну копию учредительных документов. **Физическое лицо:** паспорт, а в случае участия в аукционе представителя физического лица – паспорт и нотариально заверенную доверенность.
2. Платеж за право заключения договора аренды земельных участков осуществляется в течение 10 рабочих дней со дня утверждения протокола о результатах аукциона.
3. Победитель аукциона обязан в течение 10 рабочих дней со дня утверждения протокола о результатах аукциона возместить организатору аукциона затраты, связанные с организацией и проведением аукциона, возместить расходы по подготовке документации для проведения аукциона.
4. Всем желающим предоставляется возможность ознакомиться с объектом.
**Аукцион состоится 11 февраля 2020 года в 12.00 в здании горисполкома по адресу: г. Гродно, пл. Ленина, 2/1**.
Заявления на участие в аукционах принимаются по адресу: г. Гродно, пл. Ленина, 2/1, кабинет № 407, в рабочие дни **с 8.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00 с 13 января по 5 февраля 2020 года**.
Телефон для справок в Гродно **(0152) 72-05-37, 72-00-10**.
Адрес сайта: **www.grodno.gov.by, gcn.by**

## Извещение о проведении 24 января 2020 года повторных торгов с условиями по продаже имущества, принадлежащего ОАО «МАЗ» – управляющая компания холдинга «БЕЛАВТОМАЗ»

| Сведения о предмете торгов (продаваемом имуществе) | | | |
|---|---|---|---|
| **Наименование, характеристики продаваемого имущества, сведения о земельном участке** | **Местонахождение предмета торгов** | **Начальная цена предмета торгов с учетом НДС, бел. руб.** | **Размер задатка, бел. руб.** |
| незавершенное законсервированное «здание корпуса № 2» готовностью 58 процентов и общей площадью 20354,4 кв. м, инвентарный номер в ЕГРНИ 700/U-83233; расположенное на земельном участке с кадастровым номером 740100000002005878 площадью 4,2069 га | г. Могилев, ул. Крупской, 232 | 2 169 600,00 | 216 000,00 |

**Продавец имущества** – ОАО «МАЗ» – управляющая компания холдинга «БЕЛАВТОМАЗ», ул. Социалистическая, 2, 220021, г. Минск.
**Организатор торгов** – государственное предприятие «МГЦН», г. Минск, ул. К. Маркса, 39, к. 10.
Условие торгов: победитель торгов (покупатель) оплачивает вознаграждение за организацию и проведение торгов, включающее затраты на организацию и проведение результативного аукциона, в размере 1 процента от цены продажи предмета торгов, указанной в протоколе о результатах торгов, в течение 3 рабочих дней со дня проведения торгов.
Торги проводятся в соответствии со ст. ст. 417, 418 Гражданского кодекса Республики Беларусь и порядком проведения аукциона по продаже имущества, принадлежащего ОАО «МАЗ» – управляющая компания холдинга «БЕЛАВТОМАЗ», утвержденным организатором торгов.
К участию в торгах допускаются юридические и физические лица, заключившие соглашение с организатором торгов о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона, внесшие задаток, а также представившие организатору торгов следующие документы:
– заявление на участие в аукционе (по форме, установленной организатором торгов); заявление об ознакомлении с документами, продаваемым имуществом, порядком проведения аукциона (по форме, установленной организатором торгов); копию свидетельства о регистрации (для юридических лиц и индивидуальных предпринимателей); копию устава (для юридических лиц); копию платежного документа о внесении задатка; документы, подтверждающие полномочия представителя юридического (физического) лица; а также, при необходимости, иные документы в соответствии с порядком проведения аукциона.
Задаток перечисляется на расчетный счет государственного предприятия «МГЦН» № BY34 BPSB 3012 1049 7101 9933 0000 в Региональной дирекции № 700 по г. Минску и Минской области ОАО «БПС-Сбербанк», БИК BPSBBY2X, УНП 190398583, в срок, установленный для приема документов на участие в аукционе.
Торги проходят в форме открытого аукциона (с условиями) на повышение начальной цены. Торги проводит аукционист, определенный организатором торгов. В процессе торгов начальная цена повышается аукционистом до тех пор, пока только один участник согласится приобрести предмет торгов. Данный участник объявляется победителем торгов, а наивысшая цена (цена продажи) фиксируется в протоколе о результатах торгов и включает НДС. В ходе торгов участники могут предлагать свою цену за продаваемое имущество в соответствии с порядком проведения аукциона.
В случае если торги признаны несостоявшимися в силу того, что заявление на участие в них подано только одним участником или для участия в них явился только один участник, предмет торгов продается этому участнику (покупателю) при его согласии по начальной цене, увеличенной на 5 процентов.
Договор купли-продажи между продавцом и победителем торгов (покупателем) заключается после предъявления копии платежных документов о перечислении суммы вознаграждения за организацию и проведение торгов и подписывается в течение 10 рабочих дней со дня проведения аукциона. Оплата стоимости приобретенного имущества с учетом НДС осуществляется победителем торгов (покупателем) по согласованию с продавцом в порядке, предусмотренном в договоре купли-продажи.
**Торги проводятся 24 января 2020 года в 10.00** по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, зал аукционов. Прием документов, а также консультации по вопросам участия в торгах осуществляются с 13.01.2020 по 22.01.2020 включительно в рабочие дни с 09.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00 (по пятницам – до 16.45) по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, каб. 6.
Телефоны для справок: (017) 327-48-36 (государственное предприятие «МГЦН»); (017) 217-21-03 (ОАО «МАЗ» – управляющая компания холдинга «БЕЛАВТОМАЗ»)

## РУП «Институт недвижимости и оценки» извещает о проведении повторного открытого аукциона по продаже имущества ОАО «БЕЛГАЗСТРОЙ» – управляющая компания холдинга»

**Лот № 1, состав:** 1. Цех по производству тротуарной плитки, инв. № 122/С-10806, площадь – 905,7 кв. м. 2. Оборудование (полный перечень приведен на сайте Организатора аукциона). Адрес: Брестская обл., Ивацевичский р-н, Стайковский с/с, п. Зеленый Бор, ул. Зеленая, 32, цех по производству тротуарной плитки. Земельный участок: кадастровый номер 123488001601000049, площадь – 0,9117 га. Право постоянного пользования. **Начальная цена с НДС – 100 044,00 бел. руб. Задаток – 10 004,40 бел. руб. Шаг аукциона – 5 %**

**Аукцион состоится 22.01.2020 в 11.00 по адресу: г. Минск, ул. Комсомольская, д. 11, 3-й этаж, каб. 4**

Порядок оформления участия в аукционе, условия участия в аукционе, срок заключения договора купли-продажи, условия оплаты, а также полный текст извещения содержатся на сайте Организатора аукциона ino.by.
**Продавец:** ОАО «БЕЛГАЗСТРОЙ» – управляющая компания холдинга», 220030, г. Минск, ул. Советская, д. 4, тел. 8 (017) 200-71-17.
**Организатор аукциона:** РУП «Институт недвижимости и оценки», 220030, г. Минск, ул. Комсомольская, 11, пом. 9. Задаток перечисляется на р/с BY21BPSB30121543370109330000 в ОАО «БПС-Сбербанк», г. Минск, BIC банка BPSBBY2X. Получатель – РУП «Институт недвижимости и оценки», УНП 190055182. Назначение платежа: задаток для участия в аукционе 22.01.2020. Заявления на участие и необходимые документы принимаются в рабочие дни с 8.30 до 12.00, с 13.30 до 16.00 по адресу: г. Минск, ул. Комсомольская, 11, каб. 7. Окончание приема заявлений 20.01.2020 в 11.00. Первое, полное извещение о проведении аукциона опубликовано в газете «Звязда» от 29.11.2019.

**☎ Организатор аукциона: 8 (017) 324-70-57, 8 (029) 356-90-03, 8 (029) 550-09-52 • www.ino.by • e-mail: torgi@ino.by**

## ОБЪЯВЛЕНИЕ о повторных торгах

Государственное предприятие «**БелЮрОбеспечение**» (УНП 192821149) объявляет о проведении торгов:

лот № 6.2020.01.00038: мопед Racer RC50, 2018 г. в., принадлежащий **Семенову К. С.,** находящийся в г. Кировске, начальной стоимостью 608,00 бел. руб.

**Торги будут проведены 30.01.2020 (9.00 – 18.00) на сайте e-auction.by.**

Задаток – 10 процентов от стоимости лота зачисляется до 16.00 29.01.2020 на счет ОПИ Кировского района, № BY83AKBB36429000031057100000, ОАО «АСБ Беларусбанк», БИК AKBBBY21703, УНП 700014929.

Подробная информация размещена на сайте e-auction.by в разделе «Аукционы»

# ЛЮБІЛІ... А ЗАМУЖ НЕ ЎЗЯЛІ,

## або Пра дзевак, баб і рыбалку

## СЦЕРВА

Мой тралейбусны маршрут у той дзень пралягаў ад чыгуначнага вакзала да гасцініцы «Турыст». Прымасціўся я каля акна, а побач сеў мужчына сярэдняга ўзросту. У салоне было некалькі свабодных месцаў, якія былі заняты на ўжо першым прыпынку, і некаторыя пасажыры стаялі ў праходзе. Раптам чую жаночы голас, патрабавальны такі:

— Уступі месца.

Звярнуты ён быў да майго суседа. А той:

— Каму?

— Віцьку майму. Не бачыш, ці што?

Гляджу: побач з той кабетай стаіць хлапчук гадоў, можа, васьмі-дзевяці. Рослы такі мацак.

— Хворы? — пытаю.

— Барані божа. Яшчэ што выдумайце. Па рынку пахадзілі — стаміўся...

Мужчына паслухмяна падняўся і, прыпадаючы на левую нагу, пасунуўся па праходзе. А там з пярэдняга сядзення ўскочыў, напэўна, дзетсадавец і запрасіў майго нядаўняга суседа на сваё месца. Віця тым часам апынуўся побач са мной і ўтаропіўся ў гаджэт. Яго мама, трымаючы ў руках пакет і сумку з прадуктамі, стаяла каля яго. Сын на яе — нуль увагі. Нават не прапанаваў узяць той груз сабе на каленкі. Ды і мама яго ні аб чым не папрасіла.

Мне захацелася пачаць гаворку з Віцам, ды дзе там. Бо — пачалося! Усё апісанае вышэй рабілася на вачах многіх пасажыраў, і хтосьці з іх абурыўся. Першая была бабулька:

— Жанчына, як вам не сорамна было прагнаць кульгавага чалавека з месца?! — запытала яна.

— Не твая справа! — адрэзала кабета.

— І табе, Віця, як не сорамна, здараўцу такому? — перапыніў яе малады хлопец. — Усеўся як панбарон і нават пра маму не думаеш. Уступі месца ёй.

Хлопчык памкнуўся ўстаць, але мама загадала:

— Сядзі. І нікога не слухай.

— Бач, стаміўся, па рынку хадзячы, — уставіла сваё слова яшчэ адна жанчына. — Я ж таксама там была і следам за вамі ішла да прыпынку. Дык Віця, як малады козлік, скакаў наперадзе цябе, маладзічка. А ты ледзь ногі цягнула з такім грузам. Не шкада сябе?

— Не шкада, — агрызнулася мама Віці. — Ён у мяне адзін. Няхай сіл набіраецца. У яго яшчэ ўсё наперадзе.

У салоне пасля гэтых слоў загуло на ўсе лады. І пра тое, што прыйдзе час і пры такім выхаванні-патуранні Віця сядзе маці на галаву, што яна яшчэ пральле нямала слёз ад яго. Што няўжо ў школе цяпер не вучаць дзяцей павазе да старэйшых? Што раней, у савецкія часы, усё было інакш. Напрыклад, бацька мог адмуздаць неслуха-сына папружкай, і нічога. А цяпер сынок можа паскардзіцца на яго, і той сам атрымае па першае чысло ад міліцыі ці яшчэ ад якойсьці камісіі.

Адным словам, дыскусія гамяльчан працягвалася. Да таго часу, пакуль на шостым прыпынку тралейбус не пакінулі хлапчук Віця і яго мама, якая напаследак дала «адлуп» усім пасажырам:

— Не вучыце вучонага, а з'ешце дзярма пячонага.

Народ ад абурэння праглынуў языкі. На некалькі хвілін. І ў гэтай цішыні раздаўся голас на выгляд вясковай бабулі:

— Ой, сорам мне, людзі, сорам. Век не бачыць бы і не чуць падобнага. То ж была Верка, мая пляменніца. А мужчына, якога яна сагнала з месца, яе былы муж Іван. Казала ж яму, добраму хлопцу, калі толькі сабраўся ажаніцца з ёй: трымай у абцугах. Бо жыцця не будзе: вельмі нахабная яна. Па адной масніцы прымусіць цябе хадзіць. А ён: у нашай сям'і раўнапраўе будзе. І вось дачакаўся дэмакратыі: знявагі, скандалы ўчыняла, поедам ела. У гульні потым пусцілася, развод. Цяпер мужыка якога зацугляць хоча. Ды дурняў няма. Відаць, таму і жоўць з яе прэ. Ці праўду кажу, Іван?

Мужчына сядзеў з панурай галавой. І зацята маўчаў...

## А КАБ ЦЯБЕ РАК УБРЫКНУЎ...

Гэта гісторыя хоць ужо і ўдаўнілася, але і цяпер калі ў якой-небудзь кампаніі заходзіць размова аб рыбалцы, прыгадваю яе. Праўда, яна ў адрозненне ад іншых рыбацкіх былiц і небыліц (накшталт тых, што спайманы лешч заважыў цэлы пуд, а вочы ў акуня памерамі былі з кулак, і з гэтым усім кампанія весела і ахвотна згаджалася), нязменна выклікала сумненне ці нават адкрыты недавер. Маўляў, не магло быць такога! Каб крыгай не паймаць ніводнай рыбіны? І каб рак напалохаў рыбака да смерці? Не магло, і ўсё тут!

Асабіста ж я адразу паверыў у праўдзівасць гісторыі, пра якую гадоў сорак таму пачуў ад свайго земляка. Хоць бы па той прычыне, што быў ён не хвалько, не манюка, не фантазёр. І не прыхарошваў той браканьерскі паход, удзельнікам якога з'яўляўся.

— Дык вось, — расказваў Мікола, — я пазнаёміўся з Андрэем Пятровічам у Алушце, дзе разам адпачывалі і пралечваліся ў санаторыі. Вядома ж, хадзілі на танцы, гулялі ў карты і нават два разы на лодцы мясцовага рыбака выходзілі ў мора. Бычкоў нацягалі столькі, што таранку зрабілі і ў ахвоту з півам іх спажывалі. Іншым разам і чарку кулялі.

Адным словам, знаёмства чачараніна і гамяльчаніна, якія жылі ў адным нумары санаторыя, зблізіла абодвух да такой ступені, што размовы ў іх ішлі на любыя тэмы і, галоўнае, разуменне розных жыццёвых пытанняў і праблем было сугучным. Андрэй Пятровіч, напрыклад, пахваліўся, што хай сабе ў горадзе на Сожы ён на не надта высокай начальніцкай пасадзе, але пэўны аўтарытэт мае, з патрэбнымі людзьмі стасуецца. Нездарма ж у яго кішэні пасведчанні пазаштатнага інспектара ДАІ і рыбінспекцыі.

— Калі трэба, Мікола, — сказаў, — дык і табе ў гэтых справах паспрыяць магу.

Апошні, вядома, адмаўляцца не стаў і прапанову кампаньёна, як гаворыцца, прыняў з «тоўстым» задавальненнем. І яе, безумоўна, трэба было замачыць каньячком. Што і зрабілі. Заключным пасля выпіўкі акордам будучай здзелкі стала прызнанне Андрэя Пятровіча ў тым, што ў яго ёсць крыга і іншым разам, калі ўзнікае пільная патрэба ў рыбе, ён смела пускае яе ў ход. Пачуўшы гэта, Мікола тут жа запрасіў прыехаць да яго на рыбалку.

У маі, калі рэкі яшчэ не ўвайшлі ў свае берагі, гамяльчанін надвячоркам прыбыў у Чачэрск на асабістай «Волзе», у якой знаходзілася крыга і з якой вылез памочнік Андрэя Пятровіча Самуіл Львовіч. Калі сцямнела, напрамак быў узяты ўверх па Сожы, у бок Ворнаўкі. Надвор'е — лепш не прыдумаеш. Цяплынь. У кустах на ўсе лады шчоўкаюць-заліваюцца салаўі. Лагодны паўднёвы ветрык і няспешная плынь ракі — па якой то разыдуцца кругі, то ўзаўецца серабрыстая драбяза, то нешта моцна пляснe па вадзе.

— Будзе рыба. Можа, нават сом утлуміцца, ці з дзясятак судакоў падцупорым, — задаволена прамовіў Мікола і падаў Самуілу Львовічу, які намерыўся лезці ў ваду ў трусах, апранаху: штаны з шырокімі калашынамі, сарочку і пінжак.

А Андрэю Пятровічу, як «неабстрэленаму» ў рыбацкіх справах навічку, выдаў патрэбныя інструкцыі, назваў яго месца пры крызе:

— Ты самы высокі з нас, значыць, пойдзеш па глыбіні.

І вось тройка з прыўзнятым настроем рушыла ў ваду. Першая зацяжка. Пуста, бо рыба, напэўна, яшчэ на подступах да берага. Другая спроба. Мужыкі прайшлі ўсяго нейкіх пяць-шэсць метраў, як начную цішыню раптам разарваў такі рэзкі віск, што ў Андрэя Пятровіча і Міколы валасы дуба сталі. Ён, гэты віск, вылецеў з горла Самуіла Львовіча, які вокамгненна выскачыў з вады, упаў на траву і пачаў качацца па ёй, хапаючыся рукамі за прарэх і яшчэ мацней галосячы.

Кампаньёны, здагадаўшыся, у чым справа, кінуліся да яго на дапамогу. Сцягнулі штаны і намацалі вялікага, нібы лапаць, рака, які, здаецца, мёртвай хваткай учапіўся сваімі магутнымі клюшнямі ў пікантнае месца ахвяры і ніяк не хацеў адпускаць.

Збавенне прыйшло толькі праз тры-чатыры хвіліны, калі ратавальнікі прымянілі самыя эфектыўныя ў падобнай сітуацыі меры: пачалі, прабачце, абрушваць на «агрэсара» цёпла-салаватыя струмені са сваіх «чайнікаў». І колькі потым яны ні ўпрошвалі Самуіла Львовіча працягнуць рыбалку, той упёрся, нібы той бык:

— Не палезу ў ваду! Нізавошта!

Так вось і закончылася тая браканьерская вылазка. Праўда, госці паехалі ў Гомель не з пустымі рукамі, бо назаўтра Мікола купіў ім рыбы за свае грошы ў калгаснай рыбацкай брыгадзе. А Самуіл Львовіч вусатага гіганта-крыўдзіцеля дома засушыў і як памяць аб той майскай прыгодзе павёз яго ў Ізраіль, куды пераехаў са сваёй сям'ёй.

## ЭХ, ПРЫГАЖУНІ-ХАРАШУХІ...

— Дык куды ж накіруемся? — з гэтым пытаннем Коля Швайцаў агледзеў кампанію сваіх равеснікаў: Грышку Міхаля, Колю Лібіна, Валодзьку Чайнікава і майго старэйшага брата Івана.

Некалькі хвілін адказу не было, відавочна, па той прычыне, што кожны з хлопцаў даваў волю сваім думкам наконт дзяўчат, з якімі яны надоечы пазнаёміліся ў Селяніне і Захарполлі і з якімі карцела сустрэцца. Не паспеў яшчэ ніхто з іх выказацца, як ад завадатара кампаніі тут жа вылецела рашучае:

— Прапаную — у Залессе. Дзевак-харашух там цэлае мора. Усім хопіць.

Пярэчыць Міколу ніхто не стаў. Бо кожны добра ведаў, што ў яго ў названай вёсцы прысуха Марына, якой ён хваліўся хлопцам так: хоць яна і старэйшая за яго па ўзросце і ўжо «крыху падношаная», але ж такая ласкавая «цукер-бубачка», што ён ад яе вар'яцее.

Што «вар'яцее», дык кампаньёнам не трэба было і казаць. Бо Мікола адбіў Марыну ад мацака Петруся з Падасоўя, і той аднойчы ўзяў яго за грудкі. Ды ён не адступіў, і пачалася бойка, у якую былі ўцягнуты як яны, яго сябры, так і група падасоўцаў, якія за Петруся былі гарой. Абодвум бакам потым давялося залізваць свае раны.

— Не нарвацца б зноў на мардабой, — нервова прамовіў Грышка Міхаль.

— Адаб'ёмся, — рашуча заявіў Мікола. — Наган з сабой вазьму. Разоў колькі ў выпадку чаго смальну з яго, дык штаны не адмыюць.

Што ў Швайцава была самапал-прыпяканка, якую ён называў наганам, дык гэта факт. Я сам бачыў яе і ведаў, што Мікола іншым разам страляў з яе па вераб'ях.

То былі, памятаю, 1945—1947 гады, калі наш чачэрскі люд, як і ва ўсёй зруйнаванай у час вайны Беларусі, працаваў, нібы тыя мурашы, наладжваў свой быт. Адны туліліся тады ў зямлянках ці буданах, другія будаваліся на скорую жывую нітку, трэція (такіх было мала) жылі ў ацалелых хатах. Наша сям'я адносілася да апошняй катэгорыі. Ёй дасталося незакончанае і даведзенае да ладу ўжо ў год Перамогі жытло бацькавага брата Конана, які загінуў на вайне. Заўважу пры гэтым, што адтуль не вярнуліся ба́цькі амаль усіх названых хлапцоў, можа, таму яны мелі патрэбу параіцца па мужчынскіх гаспадарчых справах з маім — Рыгорам Андрэевічам, можна сказаць, кучкаваліся ў нас.

Вельмі цяжка тады жылося не толькі матэрыяльна. Радыё ў шмат якіх населеных пунктах яшчэ не было, аб тым, што недзе ўжо існавала тэлебачанне, ніхто і не марыў, газеты мала хто чытаў. Але ў такім вось інфармацыйным галадзе народ усё ж знаходзіў час, каб адвесці душу. Вяскоўцы, асабліва ў асенне-зімовы перыяд, збіраліся кампаніямі ў ацалелых хатах, баялі на розныя тэмы, спявалі, гулялі ў карты. Моладзь жа на вечар ці два наймала хату якога гаспадара ці гаспадыні і наладжвала там танцы. Летам такой патрэбы не было: пасядзелкі з танцамі праходзілі пад зорным небам, на прыволлі, пад зялёнымі прысадамі, каля жытла. Рыпалі гармонікі, у далёкую прастору ляцелі песні, у якія ўпляталіся галасы і дзятвы, і сталага ўзросту людзей.

Паўсюдна ў вялікіх вёсках было такое. А з малых населеных пунктаў моладзь ішла на гулянні ў тыя вялікія вёскі. Былі і выключэнні. Напрыклад, кампанія «варагаў» Міколы Швайцава пехатой ці на лодцы-«дубе» пракладвала маршрут з нашага Ганнапалля ў блізкія і далекаватыя Залессе, Селянін, Чырвоны Бераг, Іпалітаўку, Захарполле, Малынічы. Ды зусім не таму, што ім не падабаліся танцы пад гармонік кульгавага Сяргея Батрака. А па той прычыне, што хлопцы лічылі, у тых вёсках дзевак-харашух болей, што і тлумачылі майму бацьку, які дапытваўся, што іх туды цягне? Няўжо сваіх дзевак не хапае?

— Такія там прыгажуні, свет не бачыў! — быў адказ. — За тую красу не грэх і пабіцца з мясцовымі кавалерамі.

Што, вядома ж, і здаралася. Добра яшчэ, што не даходзіла да панажоўшчыны. Самае цікавае, што ніводзін з тых ганнапольскіх «варагаў-сэрцаедаў» тых вясковых красунь замуж не ўзяў. Толькі, як кажуць, пабаламуцілі ваду.

**Уладзімір ПЕРНІКАЎ.**



# МАДРЫД ПАЙШОЎ НАЛЕВА

## Як завяршыўся крызіс у Іспаніі?



Пачатак 2020-га сімвалічна ўвайшоў у найноўшую гісторыю Іспаніі — краіне нарэшце ўдалося пераадолець палітычны крызіс, які доўжыўся з вясны мінулага года. Тады прайшлі парламенцкія выбары, на якіх ніводная партыя не атрымала больш за палову дэпутацкіх мандатаў. Палітычныя сілы так і не здолелі сфарміраваць дзейны кааліцыйны Савет міністраў. У выніку ўрад на чале з генеральным сакратаром Іспанскай сацыялістычнай рабочай партыі (ІСРП) Педра Санчэсам знаходзіўся ў няпэўным статусе выконваючага абавязкі. Летась у лістападзе ў Іспаніі прайшлі датэрміновыя парламенцкія выбары (другія за год!), па выніках якіх ІСРП зноў апынулася наперадзе, аднак зноў без неабходнай большасці. Трэба было дамаўляцца з іншымі палітычнымі плынямі аб саюзе, што нарэшце ўдалося зрабіць. Днямі Кангрэс дэпутатаў (ніжняя палата парламента) з другой спробы зацвердзіў кандыдатуру генсека сацыялістаў, паведаміла El País. Такім чынам Педра Санчэс афіцыйна ўзначаліў першы кааліцыйны ўрад у пасляваеннай гісторыі. Ці ўдасца Мадрыду надзейна пераадолець зацяглы палітычны крызіс і чаго чакаць надалей?



### ЖАРСЦІ НА ДЭБАТАХ

Іспанія ўжо не першы раз апынулася ў палітычным тупіку. У канцы 2015 года ў краіне прайшлі ўсеагульныя выбары, па выніках якіх перамогу атрымала кансерватыўная Народная партыя (НП), не атрымаўшы абсалютнай большасці ў Кангрэсе дэпутатаў. З-за таго, што кандыдат ні ад адной палітычнай сілы так і не здолеў ва ўстаноўлены тэрмін дамагчыся падтрымкі парламента, было вырашана правесці яшчэ адны выбары. Па выніках галасавання, якое адбылося летам 2016-га, перамога зноў дасталася кансерватарам.

Разблакаваць тупіковую сітуацыю ў краіне ўдалося дзякуючы рашэнню федэральнага камітэта ІСРП не галасаваць супраць кандыдата ад НП Марыяна Рахоя, а ўстрымацца па яго кандыдатуры ў парламенце. Аднак не ўсе ў Сацпартыі, якая з'яўляецца традыцыйным канкурэнтам НП, былі згодныя ісці на падобную саступку, што справакавала найбуйнейшы ўнутрыпартыйны крызіс у шэрагах сацыялістаў і адстаўку Санчэса з пасады генеральнага сакратара. Праўда, праз некаторы час ён быў зноў абраны лідарам гэтай партыі. Заняць пасаду прэм'ера кіраўніку ІСРП удалося толькі летам 2018-га пасля таго, як іспанскі суд вынес вердыкт па карупцыйнай справе, у якую былі ўцягнутыя прыхільнікі НП. Сацыялісты выкарыстоўвалі гэта ў якасці падставы для рэгістрацыі ў ніжняй палаце парламента пастановы аб недаверы ўраду. У выніку Кангрэс дэпутатаў адмовіў у даверы Рахою, а прэм'ерам аўтаматычна стаў Санчэс.

Літаральна ў першыя дні гэтага года падзеі ў палітычным жыцці Іспаніі развіваліся імкліва. 5 студзеня адбыўся першы раўнд галасавання, у рамках якога прэтэндэнту на пасаду прэм'ера трэба было атрымаць падтрымку абсалютнай большасці дэпутатаў — мінімум 176 з 350. Тады Санчэсу зрабіць гэтага не ўдалося, яго падтрымалі ўсяго 166 парламентарыяў. Падчас беспрэцэдэнтных па жарсцях парламенцкіх дэбатаў, якія папярэднічалі другому (вырашальнаму) туру галасавання, лідар Народнай партыі Пабла Касада раскрытыкаваў Санчэса за тое, што прэм'ерскае крэсла ён атрымае дзякуючы пазіцыі басконскіх і каталонскіх незалежнікаў. «У нашай краіне было два ворагі — тэрарысты і путчысты. Нельга трымаць іспанцаў у закладніках, каб гарантаваць галасы для зацвярджэння», — сказаў Касада, абвінаваціўшы Санчэса ў хлусні. Лідар НП таксама раскрытыкаваў генеральнага сакратара Сацпартыі за тое, што ён заклікаў «пакінуць ззаду судовыя працэсы» ў дачыненні да каталонскіх палітыкаў. На думку Касады, гэта азначае адмову ад прынцыпу падзелу ўладаў. Палітыка Санчэса, заявіў лідар НП, прывядзе да расколу краіны. Прадстаўнік цэнтрысцкай партыі «Грамадзяне» Інэс Арымадас абрынулася з крытыкай на Санчэса за тое, што ён не стаў спрабаваць дамаўляцца з правым блокам, каб атрымаць прэм'ерства, а палічыў за лепшае заключаць дамовы з «Падэмас» і прыхільнікамі незалежнасці Каталоніі.

Санчэс у сваю чаргу адстойваў пазіцыю ІСРП пра пачатак перагавораў па каталонскай праблеме, паколькі «неабходна пераадольваць тэрытарыяльныя канфлікты, заўсёды ў рамках канстытуцыі», і заклікаў пазбаўляцца ад «таксічнага клімату» ў іспанскай палітыцы. Лідар Unidas Podemos Пабла Іглесіяс, якому дастанецца пасада віцэ-прэм'ера, паабяцаў, што кааліцыйны ўрад будзе абараняць «правы каталонцаў, баскаў і канарцаў выступаць пад тымі знакамі, пад якімі яны хочуць». Санчэс падчас свайго выступлення таксама даў зразумець, што будзе дамагацца рэфармавання канстытуцыі ў частцы працэдуры зацвярджэння кіраўніка ўрада пасля выбараў. «За апошнія чатыры гады ўрад з поўнымі паўнамоцтвамі ў нас быў паўтара года. Непрымальна, каб падобнае здаралася ў будучым. Трэба шукаць механізмы, каб такое не паўтаралася», — заявіў ён.




### 8 МЕСЯЦАЎ ДЗЕЛЯ 10 СЕКУНДАЎ

Падчас другога тура, дзе дастаткова было заручыцца падтрымкай простай большасці, генеральны сакратар ІСРП усё ж атрымаў перамогу, праўда, з перавагай усяго ў два галасы — за яго прагаласавалі 167 чалавек, 165 — супраць, яшчэ 18 устрымаліся. Голас кожнага парламентарыя або яго няўдзел у галасаванні зачытваўся па чарзе. Працэдура транслiравалася ў прамым эфіры.

Сацыялісты перамаглі і ў красавіку, і ў лістападзе, але ў другім галасаванні яны страцілі тры мандаты, атрымаўшы 120 месцаў у парламенце. У «Падэмаса» 35 крэслаў у Кангрэсе, таму ў кааліцыі няма большасці. Выступаючы перад дэпутатамі, Санчэс сказаў, што кааліцыя з'яўляецца адзіным разумным варыянтам для Іспаніі. За апошнія некалькі гадоў выбараў у краіне праходзілі пяць разоў. «Альбо прагрэсіўная кааліцыя, альбо тупік», — заўважыў ён. Саюз паміж сацыялістамі і «Падэмас» робіць Іспанію адной з нямногіх краін Еўропы з левым урадам, адзначыла The New York Times.

Раней прадстаўнік сацыялістаў Адрыяна Ластра абвінаваціла парламентарыяў правага лагера ў агрэсіўных паводзінах. Паводле яе слоў, дэпутат Томас Гітартэ з невялікай партыі «Тэруэль экзістэ» знаходзіўся пад такім моцным ціскам, што яму нават давялося хавацца. Ластра расказала, што парламентарый атрымаў восем тысяч электронных допісаў, якія заклікалі яго галасаваць супраць.

Усе перашкоды былі паспяхова пераадолены і 47-гадовы Педра Санчэс Перэс-Кастэхон стаў прэм'ерам. Цырымонія прынясення прысягі прайшла ў палацы Сарсуэла — афіцыйнай рэзідэнцыі караля Іспаніі. У прысутнасці Філіпа VI атэіст Педра Санчэс пакляўся на канстытуцыі (а не на Біблії і распяцці) «добрасумленна і сумленна выконваць абавязкі старшыні ўрада, аддана служыць каралю, захоўваць і забяспечваць захаванне канстытуцыі як асноўнага закона дзяржавы, а таксама захоўваць тайну абмеркаванняў Савета міністраў». Затым, звяртаючыся да караля, Санчэс пажартаваў: «Восем месяцаў дзеля дзесяці секундаў». Новаму іспанскаму прэм'еру сапраўды прыйшлося чакаць восем месяцаў з красавіцкіх выбараў мінулага года, каб зноў афіцыйна заняць крэсла кіраўніка ўрада.

### ПРЫ ЧЫМ ТУТ ФРАНКЕНШТЭЙН?

Прызначэнне Санчэса, супраць кандыдатуры якога выступалі правацэнтрысцкі блок — Народная партыя (НП), партыі «Грамадзяне» і Vox («Голас»), — стала магчымым не толькі ў выніку саюза з «Падэмас», але і дзякуючы падтрымцы прыхільнікаў незалежнасці Каталоніі і Краіны баскаў, у прыватнасці, партыі Левых рэспубліканцаў Каталоніі (ЛРК). Яны прагаласавалі «за» ці ўстрымаліся пры галасаванні, што і дазволіла лідару ІСРП атрымаць большасць у парламенце. Прафесар паліталогіі Мадрыдскага ўніверсітэта Франсіска Варэла Марэна расказаў Deutsche Welle, што ў кааліцыі сацыялістаў з левымі папулістамі, на яго думку, «шмат незразумелага». Калі ІСРП заўсёды была прыхільная каштоўнасцям заходняй дэмакратыі, то «Падэмас» іх не прызнае, як не прызнае ні палітычны лад Іспаніі, ні законы рынкавай эканомікі. Сярод найбліжэйшых планаў гэтай партыі — рэзкае павелічэнне расходнай часткі дзяржбюджэту, узмацненне жорсткасці ўмоў вядзення бізнесу і павышэнне падаткаў. Ну а ў перспектыве — нацыяналізацыя банкаў і прадпрыемстваў. Прафесар Варэла Марэна таксама папярэджвае, што ультралевыя могуць ускладніць адносіны Іспаніі з Еўрасаюзам. Бо «Падэмас» заклікае ігнараваць правілы ЕС, у прыватнасці, захаванне бюджэтнай дысцыпліны, патрабуе адкрыць межы для мігрантаў з Афрыкі і не выплачваць даўгі Іспаніі, якія складаюць больш чым два трыльёны еўра. Гаворка ідзе ў асноўным аб запазычанасці краінам Еўрасаюза.

Лідары ІСРП і «Падэмас» называюць свой альянс «прагрэсіўным», здольным на «стабільнае праўленне». Прадстаўнік блізкага да Сацпартыі прафсаюзнага аб'яднання Усеагульны саюз працоўных Давід Рэес выказаў у гутарцы з DW упэўненасць, што «новы ўрад гарантуе годнае жыццё, у першую чаргу, малазабяспечаным слаям насельніцтва». Між тым, па словах супрацоўніка Мадрыдскага цэнтра сацыялагічных даследаванняў Серхіа Паласа, «далёка не ўсё ў Іспаніі падзяляюць падобны аптымізм». У гутарцы з DW ён адзначыў, што шэсць з дзесяці іспанцаў, у тым ліку дзеячы-сацыялісты, не давяраюць тандэму ІСРП — «Падэмас». Гэта вынікае са снежаньскага апытання грамадскай думкі. Не праяўляюць аптымізму, па словах сацыёлага, і дзелавыя колы. Памяншаецца аб'ём капіталаўкладанняў, пачынаецца вываз капіталу з краіны, закрываюцца вытворчасці і, як следства, упершыню пасля крызісу 2008—2012 гадоў намячаецца рост беспрацоўя. Гэтыя тэндэнцыі сталі выяўляцца яшчэ ў лістападзе, калі было абвешчана аб магчымай кааліцыі сацыялістаў з «Падэмас».

З гэтых прычын будучы ўрад уяўляецца недаўгавечным як палітолагу Варэла Марэна, так і сацыёлагу Серхіа Паласу. Што ж датычыцца правацэнтрысцкага блока ў парламенце, то ён мае намер аказваць новаму кабінету, які называе «тварэннем Франкенштэйна», «жорсткую апазіцыю».

### СПРАВА ДЛЯ КААЛІЦЫІ

Упершыню ў сучаснай гісторыі Іспаніі пачаў дзейнічаць кааліцыйны ўрад. Дэкан факультэта эканамічных і сацыяльных навук Расійскай акадэміі народнай гаспадаркі і дзяржаўнай службы пры прэзідэнце РФ Аляксандр Чычын растлумачыў RT, як на курс кааліцыйнага ўрада, сфарміраванага сацыялістам Педра Санчэсам, пачне ўплываць партыя «Падэмас». «Гэта будзе той жа самы курс, які Санчэс праводзіў, калі быў старшынёй урада на працягу больш чым года, толькі з невялікай карэкціроўкай, зараз ужо з боку больш левых, чым яго палітычная партыя, сіл, — адзначыў эксперт. — Будзе больш дэмакратычны кірунак у палітыцы. Чым важная гэтая партыя? Тым, што яны могуць стаць мадэратарамі, пасрэднікамі ў нейкім урэгуляванні каталонскага пытання. Каталонія можа разлічваць менавіта на партыю «Падэмас». Дзякуючы таму што левыя рэспубліканцы ў Каталоніі ўстрымаліся ў пытанні галасавання, цяпер зразумела, што Санчэс «пазычыў» у сепаратыстаў неабходныя галасы, каб з другой спробы прайсці і стаць старшынёй урада ў абмен на тое, што ён садзіцца за стол перагавораў і пачынае вырашаць пытанне», — канстатаваў Аляксандр Чычын. Як вядома, у кастрычніку мінулага года ў Каталоніі прайшоў шэраг пратэстных акцый у сувязі з тым, што Вярхоўны суд Іспаніі прысудзіў да турэмных тэрмінаў і штрафаў 12 былых чыноўнікаў і грамадскіх дзеячаў, прызнаных вінаватымі ў датычнасці да арганізацыі рэферэндуму аб незалежнасці 2017 года.

Загадчык сектара рэгіянальных праблем і канфліктаў Інстытута сацыяльна-эканамічных міжнародных адносін імя Прымакова РАН Канстанцін Воранаў таксама перакананы, што палітыка кааліцыйнага ўрада не будзе моцна адрознівацца ад той, якую праводзіў Санчэс дагэтуль. «Перш за ўсё — імкненне захаваць цэласнасць дзяржавы і ўтаймаваць сепаратысцкія настроі, якія цяпер назіраюцца ў Іспаніі, — падкрэсліў эксперт у гутарцы з RT. — Па-другое, гэта імкненне ўпісаць Іспанію ў новы перафарматаваны пасля брэксіту Еўрасаюз».

Прэм'ер Педра Санчэс і яго намеснік Пабла Іглесіяс ужо заявілі, што маюць намер павысіць падаткі для тых, чый даход перавышае 130 тысяч еўра ў год, павялічыць мінімальную заработную плату, а таксама адмяніць некалькі рэформаў у сферы рынку працы, якія былі прынятыя папярэднім кансерватыўным урадам. Некаторыя з іх значна спрашчалі для работадаўцаў схему звальнення супрацоўнікаў. Пачатак пакладзены. Якім атрымаецца праца? Пабачым.

**Захар БУРАК.**



## ООО «Облмехотряд» в лице ликвидатора ООО «Юридическая группа «СОВЕТНИК» проводит повторные торги по продаже имущества предприятия

**Продавец:** ООО «Облмехотряд» в лице ликвидатора ООО «Юридическая группа «СОВЕТНИК»
**Организатор торгов:** РУП «Информационный центр Министерства экономики Республики Беларусь», 220030, г. Минск, ул. Берсона, 1А, комн. 513. Руководитель организатора электронных торгов – Вашемирский Максим Петрович; тел. 200-64-11, тел./факс: 200-95-63, 200-73-33, https://torgi.gov.by/.
Публичные торги в электронной форме в процедуре ликвидации (далее – электронные торги) будут проведены: **24 января 2020 г., в 8.00** на электронной торговой площадке https://torgi.gov.by/, окончание – 24 января 2020 г., 16.00.
Заявки на участие в торгах принимаются по 23 января 2020 г включительно.
Шаг аукциона – 5 %.
Для участия в торгах необходимо:
1. перечислить задаток по выбранному лоту в размере 5 % от начальной цены;
2. подать заявку по выбранному лоту на участие в торгах на сайте https://torgi.gov.by/.
Победитель торгов (претендент на покупку) обязан возместить сумму фактических затрат на организацию и проведение торгов в течение 5 рабочих дней со дня их проведения на основании представленного организатором торгов либо продавцом извещения о возмещении затрат.
Срок заключения договора купли-продажи: не позднее 7 рабочих дней со дня проведения торгов.
Срок оплаты предмета торгов: не позднее 10 рабочих дней со дня проведения торгов.
Более подробная информация о проведении торгов на сайте https://torgi.gov.by/.

| № лота | Предмет торгов | Место нахождения | Начальная цена предмета торгов, бел. руб. с НДС | Шаг торгов (5 %), бел. руб. | Сумма задатка (5 %), бел. руб. |
|---|---|---|---|---|---|
| 1 | Картофелеуборочный комбайн DR1500 GRIMME 06, инв. № 62 | Копыльский район, д. Новоселки, ул. Жижика, 68 | 25 488,00 | 1274, 40 | 1274, 40 |
| 2 | Трактор «Беларус» 82.1, инв. № 131 | Копыльский район, д. Новоселки, ул. Жижика, 68 | 14 040,00 | 702,00 | 702,00 |
| 3 | Опрыскиватель 600L 12M, инв. № 138 | Копыльский район, д. Новоселки, ул. Жижика, 68 | 1008,00 | 50,40 | 50,40 |
| 4 | ПКК-1-0100000 измельчитель, инв. № 126 | Копыльский район, д. Новоселки, ул. Жижика, 68 | 792,00 | 39,60 | 39,60 |
| 5 | ПКК 0350000 подборщик, инв. № 148 | Копыльский район, д. Новоселки, ул. Жижика, 68 | 1440,00 | 72,00 | 72,00 |
| 6 | Агрегат АДД-4004 МУ, инв. № 49 | Копыльский район, д. Новоселки, ул. Жижика, 68 | 2088,00 | 104,40 | 104,40 |
| 7 | Грабли роторные ГР-700, инв. № 128 | Копыльский район, д. Новоселки, ул. Жижика, 68 | 5472,00 | 273,60 | 273,60 |
| 8 | Машина для формирования гребней MR20, инв. № 7 | Копыльский район, д. Новоселки, ул. Жижика, 68 | 1296,00 | 64,80 | 64,80 |
| 9 | Окучник-культиватор-гребнеобразователь ОКГ-4,0, инв. № 104 | Копыльский район, д. Новоселки, ул. Жижика, 68 | 1728,00 | 86,40 | 86,40 |
| 10 | ПКК-0400000А-01 жатка для трав, инв. № 149 | Копыльский район, д. Новоселки, ул. Жижика, 68 | 5112,00 | 255,60 | 255,60 |
| 11 | Лот в составе: – капитальное строение с инв. № 642/С-12106 (назначение – здание одноквартирного жилого дома,) на земельном участке с кадастровым номером 622881304100000001 по адресу: Минская область, Копыльский район, Тимковичский с/с, д. Новоселки, ул. Гриба, 23; – забор бетонный с сеткой металлической | Копыльский район, д. Новоселки, ул. Гриба, 23 | 4518,46 | 225,92 | 225,92 |
| 12 | Лот в составе: – капитальное строение с инв. № 642/С-30375 (назначение – здание специализированное для бытового обслуживания населения) на земельном участке с кадастровым номером 622885003001000205 по адресу: Минская область, Копыльский район, Тимковичский с/с, д. Новоселки; – капитальное строение с инв. № 642/С-11283 (назначение – здание специализированное розничной торговли) на земельном участке с кадастровым номером 622881304101000107 по адресу: Минская область, Копыльский район, Тимковичский с/с, д. Новоселки, ул. Жижика, 68В; – счетчик электрический СЕ102; – забор металлический | Копыльский район, д. Новоселки, ул. Жижика, 68 | 20 143,24 | 1007,16 | 1007,16 |
| 13 | Косилка КДН -3,1, инв. № 00000105 | Копыльский район, д. Новоселки, ул. Жижика, 68 | 3096,00 | 154,80 | 154,80 |

УНП 690237064

Центр Промышленной Оценки
- Организация аукционов
- Оценка всех видов имущества

### Извещение о проведении электронных торгов

| | |
|---|---|
| Организатор аукциона | ЗАО «Центр промышленной оценки», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703 |
| Продавец | ОАО «ГЗИП», 246050, г. Гомель, ул. Интернациональная, д. 49 |
| Оператор ЭТП | ООО «ИПМ-Консалт оценка», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703 |

**Предмет электронных торгов**

**Сооружение специализированное коммунального хозяйства** (очистные сооружения) общ. пл. 146,4 кв. м, инв. № 350/С-135550, по адресу: Гомельская обл., г. Гомель, ул. Интернациональная, 49А.
**Составные части и принадлежности**: резервуар дождевых вод, песколовка, здание очистных сооружений.
**Сведения о земельном участке**: предоставлен на праве постоянного пользования для обслуживания здания очистных сооружений, общ. пл. 0,0172 га

**Начальная цена (с НДС 20 %) – 70 736,00 бел. руб.**

**Задаток 5 %** от начальной цены предмета аукциона в белорусских рублях (**BYN**) перечисляется на счет **BY60BLBB30120191021390001001;** нерезидентами РБ задаток может перечисляться в валютном экви-валенте по курсу Нацбанка РБ на дату платежа на счет: в долларах США (**USD**) – **BY76BLBB30120191021390001004** в евро (**EUR**) – **BY33-BLBB30120191021390001002;** в российских рублях (**RUB**) – **BY22BLBB30120191021390001006** в Дирекции «ОАО Белинвестбанк» по г. Минску и Минской области (адрес банка: г. Минск, ул. Коллекторная, 11), БИК BLBBBY2X, , получатель платежа – ЗАО «Центр промышленной оценки», УНП 191021390

| | |
|---|---|
| Срок подписания договора купли-продажи | **10** (десять) рабочих дней после проведения аукциона |

**Условия оплаты предмета электронных торгов**

Если между продавцом и покупателем (победитель аукциона либо единственный участник аукциона, согласившийся приобрести предмет аукциона по начальной цене, увеличенной на 5 %) в течение срока, установленного для подписания договора купли-продажи, не достигнута договоренность по срокам и о порядке оплаты предмета аукциона, такая оплата должна быть произведена в течение **30 (тридцати) календарных дней** после заключения договора купли-продажи

**Электронные торги проводятся в порядке, установленном регламентом электронной торговой площадки «ИПМ-Торги», размещенным по адресу: www.ipmtorgi.by**

Победитель аукциона либо единственный участник электронных торгов, согласившийся приобрести предмет аукциона по начальной цене, увеличенной на 5 %, обязан возместить затраты на их проведение и оплатить вознаграждение организатору аукциона в размере **2 %** в течение **3 (трех) рабочих дней** со дня проведения аукциона

Организатор электронных торгов имеет право снять предмет аукциона с электронных торгов в любое время до момента определения победителя электронных торгов без объяснения причин снятия

**Дата и время начала и окончания электронных торгов**

Начало торгов: **11.02.2020 в 11.00.**
Окончание торгов: **11.02.2020 в 12.00.**
Торги продлеваются на 10 минут с момента подачи ставки в случае если ставка поступила менее, чем за 10 минут до окончания торгов

**Дата и время окончания приема заявок**

Заявки на участие в электронных торгах принимаются **по 10.02.2020 до 17.00** на ЭТП «ИПМ-Торги» по адресу: www.ipmtorgi.by

| | |
|---|---|
| Контактные данные | +375 (17) 373-21-33; +375 (44) 704-92-06. E-mail: auction@cpo.by |

## ОБЪЯВЛЕНИЕ о повторных электронных торгах

